# АРГАНІЗАЦЫЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ НАСЕЛЬНІЦТВА. ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Па стане на 01.01.2025 года ў Віцебскай вобласці ажыццяўляюць дзейнасць 338 устаноў культуры клубнага тыпу. У параўнанні з 2023 годам колькасць устаноў культуры на тэрыторыі рэгіёна зменшылася на 2.

На базе ўстаноў культуры клубнага тыпу ў 2024 годзе працавала 2 652 клубных фарміраванняў розных жанраў і накірункаў, што на 46 менш у параўнанні з 2023 годам (у 2023 г. – 2 698). У разліку на адну клубную ўстанову колькасць клубных фарміраванняў склала 7,8 (у 2023 г. – 7,9). Яны аб’ядноўваюць 32 241 удзельніка, што на 15 больш у параўнанні з 2023 годам (у 2023 г. – 32 226). Сярэдняя напаўняльнасць клубных фарміраванняў на адну ўстанову культуры у 2024 годзе склала 95,4 чалавек (у 2023 г. – 94,8 чал.).

Гонарам з’яўляюцца калектывы мастацкай творчасці, што маюць званне ”Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь“, найменне ”народны“, ”узорны“ *(гл. табліцу ”Аматарскія калектывы з найменнем ”народны“, ”узорны“ і званнем ”Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь“ на 01.01.2025 г.)*. На цяперашні час у вобласці працуе 576 калектываў з найменнем, 21 мае званне ”заслужаны“, якія годна прадстаўляюць народную творчасць Віцебшчыны. У 2024 годзе найменні ”народны“ і ”ўзорны“ былі прысвоены 9 калектывам (г.Наваполацк, г.Віцебск, Докшыцкі, Аршанскі, Міёрскі, Гарадоцкі, Шаркаўшчынскі раёны), зняты найменні 10 (Верхнядзвінскі, Віцебскі, Гарадоцкі, Глыбоцкі, Аршанскі раёны, г.Віцебск).

Калектывы мастацкай творчасці прымаюць актыўны ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і абласных мерапрыемствах. Лідэрамі па ўдзелу ў абласных мерапрыемствах за справаздачны год сталі Глыбоцкі, Лепельскі, Лёзненскі, Аршанскі, Полацкі, Дубровенскі, Пастаўскі, Шумілінскі раёны, г.Віцебск, г.Наваполацк. Калектывам Гарадоцкага, Сенненскага, Расонскага, Чашніцкага раёнаў трэба актывізаваць удзел у мерапрыемствах.

Па выніках 2024 года клубнымі ўстановамі вобласці праведзена 96 356 (з іх 63 669 – у сельскіх установах культуры) мерапрыемстваў, што на 1 117 мерапрыемстваў больш, чым у 2023 годзе. У разліку на адну клубную ўстанову гэты паказчык складае 285,1 мерапрыемства ў год (у 2023 годзе было 280,1). Ніжэй за сярэдні паказчык назіраецца ў Бешанковіцкім, Расонскім, Ушацкім раёнах, г.Віцебску, г.Наваполацку.

У 2024 годзе праведзена 10 777 мерапрыемстваў на беларускай мове, што складае 11,2 % ад агульнай колькасці. Дадзены паказчык паменшыўся на 0,2 % у параўнанні з 2023 годам.

27 505 мерапрыемстваў праведзена на платнай аснове (на 464 мерапрыемстваў больш, чым у 2023 годзе), якія наведалі 913 356 чалавек. Анлайн праведзена 133 мерапрыемствы, з іх 4 на платнай аснове.

Трэба адзначыць, што з агульнай колькасці мерапрыемстваў праведзена 572 святаў вёсак, як і ў 2023 годдзе *(гл. табліцу ”Колькасць праведзеных святаў вёсак у рэгіёнах Віцебскай вобласці ў 2024 годзе“)*.

Установамі культуры клубнага тыпу па-ранейшаму выкарыстоўваюцца традыцыйныя формы клубных паслуг: канцэрты, тэатралізаваныя прадстаўленні, спектаклі, святы вёсак, конкурсна-гульнёвыя і забаўляльныя праграмы, тэматычныя вечары, вечары адпачынку, выставы і іншыя. Трэба адзначыць, што спецыялісты клубных устаноў звяртаюць увагу і на інавацыйныя формы дасугавай дзейнасці. У рэгіёнах набіраюць папулярнасць: вечары інтэлектуальных гульняў, лега-пацi, квэст-румы, хеппенінгі і іншыя. У кожным рэгіёне ёсць шэраг сваіх найбольш задавальняючых форм работы, якія ўсталёўваюцца зыходзячы з мясцовых абставін і патрабаванняў гледачоў.

На працягу 2024 года ў рэгіёнах вобласці функцыяніравалі 47 філарманічных пляцовак, на якіх было праведзена 312 канцэртаў. Найбольшая колькасць мерапрыемстваў праведзена на дадзеных пляцоўках у Докшыцкім, Сенненскім і Лепельскім раёнах. *Аб дзейнасці пляцовак гл. табліцу ”Аналіз дзейнасці філарманічных пляцовак у рэгіёнах Віцебскай вобласці ў 2024 г.“.*

Культурнае і інфармацыйнае абслугоўванне насельніцтва аддаленых і маланаселеных вёсак здзяйсняюць 18 аддзелаў (сектараў) па нестацыянарных формах абслугоўвання насельніцтва, у зоне абслугоўвання якіх знаходзіцца 1660 аддаленых населеных пунктаў. За 2024 год праведзена 5123 мерапрыемствы, што складае каля 23,7 мерапрыемстваў у месяц на адну ўстанову. Лепшыя паказчыкі па колькасці мерапрыемстваў – у Талачынскага, Віцебскага і Гарадоцкага раёнаў. Нізкія паказчыкі колькасці мерапрыемстваў: Шаркаўшчынскі, Аршанскі, Браслаўскі раёны.

Пры аўтаклубах дзейнічаюць клубныя фарміраванні, якіх па вобласці па стане на 01.01.2025 года налічвалася 40 адзінак з агульнай колькасцю ўдзельнікаў 401 чалавек (у 2023 годзе – 43 фарміраванні з колькасцю 447 чалавек).

На працягу года праходзіў абласны праект ”Дарогамі франтавымі“ аддзелаў (сектараў) па формах нестацыянарнага абслугоўвання насельніцтва (аўтаклубаў) Віцебскай вобласці, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вынікі праекта былі падведзены 10 снежня 2024 г. на базе філіяла ”Обальскі гарадскі Дом культуры“ ДУК ”Шумілінскі раённы цэнтр культуры“ падчас адзінага метадычнага дня.

Ва ўстановах культуры клубнага тыпу Віцебскай вобласці недастаткова развіта праектная дзейнасць. Аднак, ёсць рэгіёны і ўстановы, дзе праекты запатрабаваны і сістэматычна рэалізуюцца. Так, у 2024 годзе рэалізаваны наступныя праекты (у тэксце абазначана частка цікавых праектаў):

– Шумілінскі раён: патрыятычны праект тэматычных інсталяцый сельскіх Саветаў ”Без срока давности“, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;
– Ушацкі раён: патрыятычны праект ”Память в сердце храня“;
– Талачынскі раён: патрыятычны праект ”Мы внуки Великой Победы“;
– Гарадоцкі раён: сацыяльна-культурны праект ”Твой формат“;
– Полацкі раён: культурны праект ”Полацк – горад рамесны“;

– Докшыцкі раён: культурны праект ”Планета ЛЕТО“ (Л – лучший, Е – ежедневный, Т – творческий, О – отдых).
– Дубровенскі раён: культурны праект ”Вясковае свята яднання ”Талака“;
– Браслаўскі раён: сацыяльна-культурны праект ”След у гісторыі“;
– Шаркаўшчынскі раён: культурны праект ”Пакуль жывуць традыцыі“;
– Лепельскі раён: гуманітарны сацыяльны праект “Этнаграфічная лабараторыя ”Смак мінулага“;
– Віцебскі раён: сацыяльна-культурны праект ”Наша хата талентамі багата“.

Па выніках праведзенага аналіза супрацоўнікам устаноў культуры неабходна:

звярнуць увагу на работу творчых калектываў для розных катэгорый насельніцтва, асабліва на ўдзел у мерапрыемствах рознага ўзроўню;

актывізіраваць працу ”народных“, ”узорных“ калектываў і іх удзел у міжнародных, рэспубліканскіх і абласных мерапрыемствах;

прадоўжыць практыку рэалізацыі праектаў, асабліва для дзяцей і падлеткаў.

**Аматарскія калектывы з найменнем ”народны“, ”узорны“ і званнем ”Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь“ на 01.01.2025 года**

| Раён/горад | Колькасць | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | удзельнікаў | ”народны“ | ”узорны“ | ”Заслужаны“ |
| Аршанскі | 30 | 709 | 21 | 7 | 2 |
| Бешанковіцкі | 10 | 190 | 9 | 1 | - |
| Браслаўскі | 12 | 193 | 10 | 2 | - |
| Верхнядзвінскі | 13 | 208 | 10 | 3 | - |
| Віцебскі | 10 | 157 | 8 | 2 | |
| Гарадоцкі | 13 | 265 | 10 | 1 | 2 |
| Глыбоцкі | 16 | 348 | 11 | 5 | - |
| Докшыцкі | 10 | 181 | 10 | - | - |
| Дубровенскі | 12 | 191 | 8 | 3 | 1 |
| Лепельскі | 15 | 316 | 11 | 3 | 1 |
| Лёзненскі | 10 | 153 | 10 | - | - |
| Міёрскі | 8 | 111 | 7 | 1 | - |
| Пастаўскі | 12 | 202 | 10 | 2 | - |
| Полацкі | 46 | 971 | 36 | 7 | 3 |
| Расонскі | 5 | 86 | 5 | - | - |
| Сенненскі | 7 | 108 | 7 | - | - |
| Талачынскі | 9 | 143 | 9 | - | - |
| Ушацкі | 7 | 144 | 6 | 1 | - |
| Чашніцкі | 9 | 177 | 8 | 1 | - |
| Шаркаўшчынскі | 9 | 162 | 6 | 3 | - |
| Шумілінскі | 14 | 234 | 11 | 3 | - |
| г.Віцебск | 32 | 1181 | 22 | 7 | 3 |
| г.Наваполацк | 15 | 353 | 12 | 3 | - |
| **УСЯГО:** | **324** | **6 783** | **257** | **55** | **12** |

**Колькасць праведзеных святаў вёсак**
**у рэгіёнах Віцебскай вобласці ў 2024 годзе**
*(параўнальны аналіз з 2023 г.)*

| Раён/горад | Колькасць | |
|---|---|---|
| | 2024 | 2023 |
| Аршанскі | 87 | 62 |
| Бешанковіцкі | 10 | 13 |
| Браслаўскі | 24 | 21 |
| Верхнядзвінскі | 19 | 19 |
| Віцебскі | 14 | 23 |
| Гарадоцкі | 40 | 29 |
| Глыбоцкі | 15 | 25 |
| Докшыцкі | 46 | 36 |
| Дубровенскі | 22 | 18 |
| Лепельскі | 17 | 17 |
| Лёзненскі | 67 | 53 |
| Міёрскі | 14 | 10 |
| Пастаўскі | 39 | 36 |
| Полацкі | 13 | 36 |
| Расонскі | 9 | 10 |
| Сенненскі | 37 | 31 |
| Талачынскі | 36 | 47 |
| Ушацкі | 11 | 33 |
| Чашніцкі | 22 | 21 |
| Шаркаўшчынскі | 16 | 21 |
| Шумілінскі | 14 | 11 |
| **УСЯГО:** | **572** | **572** |

**Аналіз дзейнасці філарманічных пляцовак
у рэгіёнах Віцебскай вобласці ў 2024 г.***

*(параўнальны аналіз з 2023 г.)*

| Раён | Колькасць філарманічных пляцовак | Колькасць канцэртаў (усяго) | | Колькасць канцэртаў ДШМ | | Колькасць канцэртаў калектываў клубных устаноў раёна | | Колькасць канцэртаў праведзеных ДКУ ”Віцебская абласная філармонія“ | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2024 | 2023 | 2024 | 2023 | 2024 | 2023 | 2024 | 2023 |
| Аршанскі | 4 | 26 | 62 | - | 1 | 26 | 62 | - | - |
| Бешанковіцкі | 2 | 21 | 23 | 5 | 5 | 16 | 18 | - | - |
| Браслаўскі | 2 | 2 | 3 | - | - | 2 | 3 | - | - |
| Верхнядзвінскі | 2 | 4 | 4 | 2 | 1 | 2 | 3 | - | - |
| Віцебскі | 3 | 32 | 25 | 24 | 15 | 8 | 10 | - | - |
| Гарадоцкі | 2 | 6 | 9 | 1 | 2 | 5 | 7 | - | - |
| Глыбоцкі | 2 | 21 | 21 | 5 | 5 | 16 | 16 | - | - |
| Докшыцкі | 3 | 89 | 84 | 38 | 35 | 51 | 48 | - | 1 |
| Дубровенскі | 1 | 2 | 2 | - | - | 2 | 1 | - | 1 |
| Лепельскі | 4 | 27 | 29 | 1 | 1 | 26 | 28 | - | - |
| Лёзненскі | 1 | 7 | 7 | 2 | 2 | 5 | 5 | - | - |
| Міёрскі | 2 | 1 | - | - | - | 1 | - | - | - |
| Пастаўскі | 4 | 3 | 5 | 3 | 4 | - | - | - | 1 |
| Расонскі | 2 | 6 | 1 | - | - | 6 | 1 | - | - |
| Сенненскі | 3 | 44 | 50 | 9 | 10 | 34 | 40 | 1 | - |
| Талачынскі | 2 | 2 | 2 | - | - | 2 | 2 | - | - |
| Ушацкі | 2 | 2 | 1 | - | - | 2 | 1 | - | - |
| Чашніцкі | 2 | 6 | 2 | - | - | 6 | 2 | - | - |
| Шаркаўшчынскі | 2 | 3 | 17 | 2 | 1 | 1 | 16 | - | - |
| Шумілінскі | 2 | 8 | 2 | 2 | - | 6 | 2 | - | - |
| **УСЯГО:** | **47** | **312** | **349** | **94** | **82** | **217** | **265** | **1** | **3** |

**Аналіз падрыхтаваны па дадзеным, што змешчаны ў справаздачах раёнаў вобласці за 2024 год.*

# АНАЛІЗ ДЗЕЙНАСЦІ ФАЛЬКЛОРНЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ ВА ЎСТАНОВАХ КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА 2024 ГОД

Прыярытэтнымі задачамі у рабоце клубных устаноў застаюцца адраджэнне, развіццё і папулярызацыя беларускіх нацыянальных традыцый і фальклору, што з'уляецца  падмуркам нацыянальнай самасвядомасці.

Установы культуры Віцебскай вобласці з’яўляюцца асноўнымі каардынатарамі працэсаў развіцця рэгіянальнай культуры. Кожны раён мае вядучыя фальклорныя калектывы, якія вывучаюць і захоўваюць мясцовай традыцыі, назапашаны багаты вопыт фальклорнай спадчыны калектывамі беларускай нацыянальнай кухні, фальклору і гульні.

Самабытнае аблічча традыцыйнай культуры Віцебшчыны на пачатак 2024 года, прадстаўлена 157 фарміраваннямі фальклорнага накірунку, з іх 99 – для дарослых, з колькасцю ўдзельнікаў 1 151 чалавек; 58 – для дзяцей, з колькасцю ўдзельнікаў 616 чалавек. Удзельнікі гэтых калектываў вывучаюць лад жыцця нашых продкаў, нацыянальныя і культурныя традыцыі, звычаі і абрады, багацейшы духоўны свет, мудрасць, надзвычайны талент нашага народа, а таксама захоўваюць і папулярызуюць гэтыя каштоўнасці ў сучасным жыцці.

Гонарам Віцебшчыны з’яўляюцца калектывы з найменнем ”народны“ – 42, ”узорны“ – 3 (установы культуры). Гэтыя калектывы вылучаюцца непасрэднасцю, эмацыянальнасцю і самабытнасцю, высокай сцэнічнай і выканальніцкай культурай.

Аналізуючы развіццё аматарскай народнай творчасці, неабходна адзначыць стабільнасць працы фальклорных калектываў Віцебшчыны. Іх дзейнасць значна стымулюе ўсталяваная сістэма фестывальна-святочных мерапрыемстваў самых розных узроўняў і жанраў на аснове народных традыцый і рамёстваў.

Шмат увагі захаванню і развіццю народных традыцый надаюць клубы нацыянальнай кухні, гульні і фальклору, якія створаны амаль у кожным  раёне, 15 з іх маюць найменне ”народны“.

Найбольшая колькасць фальклорных фарміраванняў у Пастаўскім раёне – 16, Талачынскім, Гарадоцкім, Сенненскім раёнах па 13, у Полацкім і Чашніцкім па 12, Глыбоцкім – 9.

| Раён | Колькасць фальклорных фарміраванняў | з іх для дзяцей | з найменнем ”народны“ | з найменнем ”узорны“ |
|---|---|---|---|---|
| Пастаўскі | 16 | 6 | 2 | |
| Гарадоцкі | 13 | 3 | 5 | |
| Сенненскі | 13 | 4 | 3 | |
| Талачынскі | 13 | 4 | 2 | |
| Полацкі | 12 | 8 | 2 | 1 |
| Чашніцкі | 12 | 7 | 3 | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Глыбоцкі | 9 | 6 | 1 | |
| Шаркаўшчынскі | 8 | 4 | 3 | |
| Аршанскі | 8 | 1 | 1 | 1 |
| Лёзненскі | 7 | 2 | 1 | |
| Ушацкі | 7 | 2 | 3 | 1 |
| Шумілінскі | 7 | 2 | 2 | |
| Міёрскі | 6 | | 2 | |
| Браслаўскі | 5 | 2 | 1 | |
| Лепельскі | 5 | 3 | 2 | |
| Дубровенскі | 4 | 2 | 2 | |
| Віцебскі раён | 4 | 1 | | |
| Бешанковіцкі | 2 | | 2 | |
| Докшыцкі | 2 | 1 | 1 | |
| Верхнядзвінскі | 2 | | 2 | |
| г.Наваполацк | 1 | | 1 | |
| Расонскі | 1 | | 1 | |

Найбольш яркай праявай самабытнасці Віцебскага рэгіёна з'яўляюцца Калядны комплекс (”Жаніцьба Цярэшкі“), масленічны комплекс, валачобныя абрады, Купалле, Спасы, памінальны цыкл абрадаў. У каляндарна-земляробчым цыкле Віцебшчыны існуе нераўнамерная захаванасць элементаў народнай культуры, некаторыя абрадавыя дзеянні здзяйсняюцца да цяперашняга часу: упрыгожванне дамоў зелянінай на Тройцу, памінальныя абрады Дзядоў, асвячэнне вярбы, афарбоўванне яек, асвячэнне яблыкаў і г. д.

У верасні адбыўся абласны этап конкурсу народнай творчасці ”Галасы Радзімы“ у межах Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу народнай творчасці. Мэта конкурсу – захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і традыцыйнай народна-песеннай культуры, культурных традыцый і культурнай самабытнасці ўсіх рэгіёнаў, папулярызацыя традыцыйных формаў народна-песеннай творчасці, пераемнасць культурных традыцый, перадача духоўнага і культурнага вопыту падрастаючаму пакаленню. У конкурсе прымалі удзел дзіцячыя і дарослыя фальклорныя калектывы, творчыя мастацкія калектывы і індывідуальныя выканаўцы Віцебскай вобласці.

У межах правядзення XXXIII Міжнароднага фестывалю народнай музыкі ”Звіняць цымбалы і гармонік“ у г.Паставы адбыўся конкурс калектываў і індывідуальных выканаўцаў на народных інструментах ”Хто каго?“. У выставачных залах Дома рамёстваў праходзіла традыцыйнае мерапрыемства ”Скарбонка народных талентаў“. Гасцям прапанаваліся майстар-класы па побытавых танцах ”Падыспань“, ”Каробачка“, ”Лысы“. Народны калектыў народнай кухні, гульні і абраду ”Традыцыя“ запрашаў гасцей свята паспрабаваць традыцыйную страву Пастаўшчыны ”Клёцкі з душамі“. З мэтай папулярызацыі лепшых узораў і здабыткаў беларускай традыцыйнай культуры сярод падлеткаў і моладзі, у Пастаўскім раёне ладзіцца традыцыйныя

культурна-асветніцкая акцыя ”Святкуем па-беларуску“, дзе абавязкова прадстаўляюць народную гульню моладзі ”Яшчар“. Гульня ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Конкурс выканаўцаў народных песень ”Галасісты Салавей“ у рамках Міжнароднага фестывалю песні і музыкі ”Дняпроўскія галасы ў Дуброўне” адбыўся ў трэці раз. Народныя песні прагучалі у выкананні прадстаўнікоў Рэспублікі Казахстан, Расію прадстаўляла Смаленская вобласць і Татарстан, Рэспубліку Беларусь – Брэсцкая, Віцебская, Магілёўская, Гомельская, Мінская вобласці.

Народныя і аўтарскія прыпеўкі гучалі на абласным конкурсе народнай музыкі і прыпеўкі ”А музыкі граюць, граюць…“ у межах XXXIII Міжнароднага фестываю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“, які адбыўся 14 ліпеня 2024 года. У конкурсе ўдзельнічалі салісты-прыпевачніцы з 16 раёнаў Віцебскай вобласці. Узрост канкурсантаў ад 18 да 75 гадоў.

Гістарычна-культурная каштоўнасць дзіцячых фальклорных калектываў падкрэсліваецца на абласным аглядзе-конкурсе фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі ”Ад прашчураў да зор“, што адбыўся ў XIV раз 1 лістапада ў ДУК ”Расонскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“. У аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел калектывы і выканаўцы з 17 раёнаў Віцебскай вобласці, творчая дзейнасць якіх грунтуецца на засваенні традыцыйнай лакальнай народнай культуры.

У многіх клубных установах Віцебскай вобласці дзейнічаюць этнаграфічныя куткі, у якіх сабраны прадметы сялянскага побыту мінулых часоў, старадаўнія прылады працы, вырабы народных рамёстваў. У філіяле ”Далёкаўскі клуб-бібліятэка“ Браслаўскага раёна маюцца эксклюзіўныя сцэнічныя касцюмы, зробленыя з выкарыстаннем тканіны і карункаў набытых у далячанскіх бабуль. У філіяле ”Мазалаўскі сельскі дом культуры“ Віцебскага раёна дзейнічае этнаграфічная выстава ”З гарышчаў бабуль і дзядуль“, дзе змешчаны прадметы побыту беларусаў XIX-XX стагоддзяў, па якой ладзяцца экскурсіі з інтэрактыўнымі элементамі для гасцей і жыхароў аграгарадка. Фальклорны калектыў ”Жывая спадчына“ філіяла ”Тулаўскі СДК“ Віцебскага раёна вывучае элементы фальклора, актыўна папулярызуе іх сярод вясковага і гарадскога насельніцтва. Паспяховымі былі і экспедыцыі па вёсках Запольскага сельскага савета адкуль прывезлі звесткі аб масленічнай традыцыі ”Шыла куваць“. У в.Задзвінне Віцебскага раёна створаны хатні этнаграфічны музей Хацько В.М. з вялікай колькасцю сабраных прадметаў даўніны, мэблі, посуду, хатніх прылад, вышыўкі і ткацтва, і вялізнай калекцыяй драўляных цацак. З в.Заполле Віцебскага раёна прывезлі магнітафонную касету з запісам дуэта мясцовых музыкаў Шлыкава І.І. (цымбалы) і Брылева Л.І (гармонік). На касеце дванаццаць танцавальных мелодый, сярод якіх ”Нарэчанька“, ”Кракавяк“, ”Сяменаўна“, ”Вальс“, ”Зяленая рошча“.

У Докшыцкім раёне адкрыта этнаграфічная сядзіба ”Вецяра“ з мэтай адраджэння і папулярызацыі нацыянальнай культуры, традыцый, абрадаў, рамёстваў. У сядзібе для насельніцтва прапануюцца розныя праграмы

фальклорнага накірунку. Яны ўключаюць ў сябе знаёмства з прадметамі побыту сялян, гульні каля печы, сустрэчы з пячурнікам, гарцуком, майстар-класы ад Дома рамёстваў. Гаспадыня Васіліна частуе наведвальнікаў стравамі беларускай кухні, прыгатаванымі ў печы, а удзельнікі народнага калектыву нацыянальнай кухні і гульні ”Шчадроўка“ паказваюць майстар-клас прыгатавання дранікаў на калодзе.

Штогод на Лепельшчыне адбываецца калядная гульня ”Жаніцьба Цярэшкі“, якая атрымала статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі і набывае ўсё большую папулярнасць і ў сельскай, і ў гарадской моладзі. Абрад стаў аб’ектам сюжэта ”Древнеславянский Tinder: як маладых ”жэняць“ на тэлеканале НТВ.

На базе ДУК ”Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“ пачала працаваць школа фальклорнага танца ”Талачынскія закаблукі“. У аграгарадку Ходцы Сенненскага раёна ладзіцца рэгіянальнае свята традыцыйнай культуры ”Тут у Ходцах вечарынка гудзе“. Свята праводзіцца як агляд фальклорных калектываў і дзеля папулярызацыі ”Ходцаўскай кадрылі“.

Сярод значных мерапрыемстваў, скіраваных на захаванне фальклорнай спадчыны Віцебскага рэгіёна, трэба адзначыць традыцыйную масленічную гульню ”Пахаванне дзеда“, што праводзіцца штогод у першы дзень Масленіцы ў вёсках Даўгапольскага сельскага Савета Гарадоцкага раёна. У 2013 годзе годзе гульня была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У Полацкім раёне у рамках раённага праекта ”Школа народных традыцый“ фальклорныя калектывы актыўна папулярызуюць рэгіянальныя традыцыі праз адкрытыя мерапрыемствы, этна-экскурсы, майстар-класы, мерапрыемствы фальклорнага напрамку. У чэрвені 2024 года ў Полацкім раёне адбыўся абласны семінар-стажыроўка ”Выкарастанне элементаў фальклору ў сучаснай практыцы“ для кіраўнікоў фальклорных калектываў клубных установ культуры Віцебскай вобласці.

Ансамбль ”Блізнянка“ філіяла ”Сільніцкі сельскі Дом культуры“ – ініцыятар адраджэння і папулярызацыі на Полаччыне аднаго з найбольш адметных святаў земляробчага календара Юр’е, абстаўленага шэрагам урачыстых абрадавых дзеянняў. Дадзены ”брэнд“ набыў велізарную папулярнасць сярод жывёлаводаў СУП ”Блізніца“ і мясцовага насельніцтва. Асаблівае месца ў практыцы ансамбля займаюць жанры сямейна-абрадавага фальклору з асобым мясцовым каларытам: ”Хрэсьбіны“ (абрадавая дзея ”Мыццё барод“, ”Катанне бабкі ў начоўках“, ”Частаванне бабінай кашай“), ”Запоіны“, ”Вяселле“ (абрадавыя дзеянні ”Абадраць казла“, ”Выкуп падушак“, ”Кража курэй“), якія і сёння карыстаюцца вялікім попытам у мясцовага насельніцтва. У снежні 2024 года ансамбль ”Блізнянка“ прадставіў рэгіянальную абрадавую дзею ”Мыццё барод“ сямейна-родавага абрада ”Хрэсьбіны“ населенных пунктаў Полацкага раёна на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. На падставе адпаведнасці крытэрыям Кодэкса

Рэспублікі Беларусь аб культуры і Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, абрадавая дзея ”Мыццё барод“ сямейна-родавага абраду ”Хрэсьбіны“ населенных пунктаў Полацкага раёна Віцебскай вобласці прапанавана для ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Паспяхова прадаўжае сваю працу народны тэатр фальклору ”Цярэшка“ Глыбоцкага ЦТКіНТ на рахунку якога ўдзел у XI Міжнародным турніры нацыянальных танцаў ”Танцуем разам“ у межах XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“, Рэспубліканскім конкурсе ”Беларусь – мая песня“ (Палац Рэспублікі, г. Мінск), гала-канцэрце майстроў мастацтва для ўдзельнікаў XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ”Судьба у нас одна, и в этом наша сила“, гала-канцэрце ”Время выбрало нас“ у межах Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі ”Марафон единства“.

Упэўнена працуюць дзіцячыя фальклорныя калектывы: дзейнасць узорнага фальклорнага калектыву ”Лецейка“ накіравана на фарміраванне ў дзяцей музычных і творчых здольнасцей сродкамі беларускага фальклору, захаванне мясцовых традыцый і абрадаў, аднаўленне і пашырэнне рэпертуару. Фальклорнае тэатралізаванае прадстаўленне ”Кола беларускіх святаў“ стала візітнай карткай калектыву. У 2024 годзе калектыў прымаў удзел у XII Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва ”Берагіня“ Гомельскай вобласці, у здымках тэлепраграм: ”Жывая даўніна“ тэлеканала ”Беларусь 3“, ”Як паглядзець“ тэлеканала АНТ, ”Еда хоть куда“ тэлеканала ”НТВ-Беларусь“.

Святочнаму народнаму календару падпарадкавана дзейнасць фальклорнага калектыў ”Бульбашыкі“ Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці, які можа ўпэўнена рыхтавацца да атрымання наймення ”ўзорны аматарскі калектыў“.

Фальклорныя калектывы Віцебшчыны прымаюць ўдзел у шматлікіх праектах і актыўна развіваюць міжнародныя сувязі: народны фальклорны клуб ”Кругаверць“ Лепельскага раёна прыняў удзел у свяце ”Саламяныя цуды“ ў рамках сумеснага праекта Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту; народны фальклорны ансамбль ”Глейна“ прыняў удзел у абласным фальклорным фестывалі ”Знак русского“ імя В.Сяргеевай у в.Царкавішча Усвяцкага раёна Пскоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі; народны фальклорны калектыў ”Сенькавіца“ Верхнядзвінскага раёна прыняў удзел у X Міжнародным фальклорным фестывале ”Соловьиная ночь“ у г.Пскоў.

Віцебшчына дэманструе ўсяму свету захаванне і жыццяздольнасць мясцовых традыцый нацыянальнай кухні, якія сёння вывучаюцца і працягваюцца многімі аматарскімі аб’яднаннямі вобласці. Кожнае аб’яднанне мае свае ўнікальныя адметныя стравы, якія з’яўляюцца іх своеасаблівай “візітнай карткай”: клёцкі з душамі ў Лепелі, пярловыя крупы і бліны на калодзе ў Шаркаўшчыне, “рагаты” каравай і пасахі ў Дуброўне. Вялікую папулярнасць набылі розныя выставы-дэгустацыі на міжнародных і абласных мерапрыемствах Віцебскай вобласці. Калектывы нацыянальнай кухні

прымаюць удзел у здымкіах тэлеперадач: ”Дадому ў невядомае“, ”Путевка-by“ ”Беларускі стандарт“, ”Як дома“.

## Работа ўстаноў культуры Віцебскай вобласці па зберажэнні і папулярызацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны

У апошні час назіраецца прыкметны рост цікавасці да традыцыйных каштоўнасцяў, што дазваляе ахарактарызаваць дадзеную сітуацыю як культурнае адраджэнне. Але, на жаль, з кожным годам вырашаць гэтыя задачы становіцца ўсё цяжэй, бо хутка сыходзяць з жыцця людзі старэйшага пакалення – носьбіты культуры, у якіх захавалася ў памяці інфармацыя аб старадаўніх звычаях, абрадах, рамёствах, захаванне пэўнага ўкладу жыцця.

Народная культура Віцебшчыны развіваецца ў сітуацыі дзяржаўнай падтрымкі, што дазволіла адрадзіць забытыя і рэдкія рамёствы, нацыянальную кухню, стварыць умовы для развіцця фальклорных калектываў.

У краіне створаны Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны ”Жывая спадчына Беларусі“. У рэгіянальны рэестр уключаны 25 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Віцебскай вобласці:

1. Традыцыйная гульня ”Жаніцьба Цярэшкі“ у Лепельскім раёне.
2. Традыцыя ажурнага ткацтва ў Гарадоцкім раёне.
3. Масленічная абрадавая гульня ”Пахаванне дзеда“ ў Гарадоцкім раёне.
4. Традыцыйная тэхналогія выпечкі жытняга хлеба ў в.Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна.
5. Тэхналогія прыгатавання традыцыйнай стравы ”Масляны баран“ у в.Мацюкова Глыбоцкага раёна.
6. Традыцыя вырабу валёнак у Міёрскім раёне.
7. Абрад ”Насіць намётку“ вёскі Папшычы Глыбоцкага раёна.
8. Традыцыя маляваных дываноў (маляванак) Віцебскага Паазер’я.
9. Традыцыйныя вясельныя звычаі Дубровенскага раёна.
10. Традыцыйная страва ”Клёцкі з ”душамі“ Віцебскай вобласці.
11. Народная гульня моладзі ”Яшчар“ вёскі Гута Пастаўскага раёна.
12. Спеўная традыцыя выканання купальскіх і жніўных песень ”у перахлёст“ у в.Багатырская Полацкага раёна Віцебскай вобласці.
13. Традыцыйная тэхналогія спіральнага пляцення Гарадоцкага, Браслаўскага, Верхнядзвінскага раёнаў Віцебскай вобласці і горада Віцебска.
14. Інсітнае (наіўнае) мастацтва Віцебшчыны.
15. Беларускія практыкі саломапляцення.
16. Абрад ”Розгары“ ў аграгарадку Лукомль Чашніцкага раёна.

17. Традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных цацак Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння.
18. Беларускае мастацтва выцінанкі.
19. Ткацтва посцілак у тэхніцы аднабаковага перабору Лепельскага раёна Віцебскай вобласці.
20. Традыцыйная калядная батлейка ”Віцебскі жлоб“.
21. Стравы з таркаванай бульбы – дранікі, бульбяныя бліны, бабка і іншыя традыцыі прыгатавання і спажывання Віцебскай вобласці.
22. ”Культура беларускаяй дуды на Віцебшчыне“.
23. ”Традыцыйнае інструментальнае выканальніцтва на дыятанічных цымбалах“.
24. Тэхналогія аплятання бяростай ганчарнага посуду.
25. ”Абрадавая дзея ”Мыццё барод“ сямейна-родавага абраду ”Хрэсьбіны“ Полацкага раёна.

ДУ “Віцебскі ОМЦНТ” праводзіць збор, ідэнтыфікацыю, апісанне перспектыўных элементаў НКС, а таксама выяўленне іх спецыфічных адрозненняў ад іншых элементаў.

**Рэйтынг элементаў НКС, унесеных у Дзяржаўны спіс ГКК Рэспублікі Беларусь:**

| | |
|---|---|
| Глыбоцкі раён | 9 |
| Пастаўскі раён | 8 |
| Лепельскі раён | 8 |
| Полацкі раён | 8 |
| Браслаўскі раён | 8 |
| Гарадоцкі раён | 7 |
| Шаркаўшчынскі раён | 6 |
| Сенненскі раён | 6 |
| Верхнядзвінскі раён | 6 |
| Дубровенскі раён | 5 |
| г.Віцебск | 5 |
| Докшыцкі раён | 4 |
| Ушацкі раён | 4 |
| Міёрскі раён | 4 |
| Лёзненскі раён | 4 |
| Віцебскі раён | 4 |
| Шумілінскі раён | 4 |
| г.Наваполацк | 3 |
| Чашніцкі раён | 3 |
| Аршанскі раён | 3 |
| Бешанковіцкі раён | 3 |
| Расонскі раён | 2 |
| Талачынскі раён | 1 |

З мэтай захавання і папулярызацыі элементаў НКС ўстановамі культуры Віцебскай вобласці было арганізавана шмат мерапрыемстваў: ”Традыцыйная калядная батлейка Віцебскі жлоб“ была прадстаўлена на сцэне Палаца Рэспублікі ў г.Мінску, дзе адбыўся гала-канцэрт калектываў мастацкай творчасці Віцебскай вобласці ў рамках фестывалю ”Беларусь – мая песня“. Паказ гэтага элемента НКС адбыўся ў сумесным праекце Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў музеі. У сродках масавай інфармацы выйшла праграма ”Беларускі стандарт“ МРТК ”МИР“, прысвечаная батлейцы і элементу НКС ”Традыцыйная калядная батлейка Віцебскі жлоб“; раённае свята бульбы ”Бульбяны фэст“, якое праводзілася на базе Германавіцкага мастацка-этнаграфічнага музея Я.Н.Драздовіча па папулярызацыі элемента НКС ”Стравы з таркаванай бульбы”; раённае свята ”І ў клёцак ёсць душа“ і конкурс на лепшую страву ”Клёцкі з душамі“ адбылося на базе Радзюкоўскага СДК Шаркаўшчынскага раёна; на тэрыторыі музея-сядзібы І.Я.Рэпіна ”Здраўнёва“ адбылася выстава-дэгустацыя рэгіянальных страў ў рамках абласнога фестывалю беларускай нацыянальнай кухні ”Дзвінскі смак“; ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту (в.Азярцо, Мінскі раён) праведзена прэзентацыя традыцыйнай стравы ”Клёцкі ”з душамі“ Віцебскай вобласці, а таксама майстар-клас па прыгатаванні дранікаў.

Народны фальклорны ансамбль ”Галасы спадчыны“ філіяла ”Багатырскі СДК“ ДУК ”Полацкі раённы Цэнтр культуры“, беражліва захоўвае традыцыі рэгіянальнага фальклору і яго каларыт. Адраджае старадаўнія сямейна-побытавыя абрады: ”Вяселле“, ”Другі дзень вяселля“, ”Хрэсьбіны“, ”Радзіны“, песні і танцы сваёй мясцовасці, а таксама абрады земляробчага календара ”Засеўкі“, ”Зажынкі“, ”Дажынкі“, якія шмат гадоў жылі толькі ў памяці жыхароў навакольных вёсак. Далучае жыхароў да традыцый святаў ”Каляды“, ”Масленіца“, ”Вялікдзень“, ”Стрэчанне“, ”Дабравешчанне“, ”Саракі“, ”Сёмуха“, ”Купалле“ і інш. Адной з адметнасцяў калектыву з’яўляецца захаванне старадаўняй манеры выканання аўтэнтычных купальскіх і жніўных песень ”у перахлёст“, унесенай у 2019 годзе ў Дзяржаўны Спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

У раёнах Віцебскай вобласці створаны фота/відэафонды элементаў нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, якія папаўняецца штогод. Аформлены альбомы, буклеты, зборнікі, распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па кожнаму элементу.

У рапрацоўцы на 2025 год знаходзіцца наступныя элементы: вышыўка ”перавіць“, ”перавіць з насцілам“, ”каляровая перавіць“; шасцінітовае ткацтва ”Перабор“ на кроснах; страва ”Сарокі“ (Верхнядзвінскі раён), традыцыйныя танцы ”Аляксандра“, ”Каробачка“, карагод ”Каценька“, традыцыя ушанавання крыніц ў в.Буй Крыпульскага сельсавета, Крыніца ”Святога Яна в. Чарневічы“, вясельны абрад ”Ваўчыха“, праваслаўны абрад ”Насіць намётку на Варварку“ (Глыбоцкі раён), ”Комплекс вясельных стараў Пастаўшчыны“, ”Рамашкаўскія карагоды“, ”Рамашкаўская Лявоніха“, ”Крыўлянская кадрыля“, гульнёвы

карагод ”Чарнавусы каралёк“ (Талачынскі раён), ”Лявоніха па-матырынску“, масленічная традыцыя ”Куванне шыла“, традыцыя прыгатавання аўсянага кісялю, абрад ”Калодкі“, кадрылі ”Адаменская“, ”Кавалёўская“, ”Перамонтаўская“, ”Віцебская маёліка“, элементы вясельнага абраду: падглядкі, выкраданне посуду в. Кругліца Чашніцкага раёна, ”Тэхналогія ўпрыгожвання абразоў у традыцыйнай тэхніцы“, традыцыйныя стравы Дубровенскага раёна: ”Пасахі“, ”Цатні“, ”Праснакі“.

У традыцыйнай культуры закладзены вялікі патэнцыял, але калі яна не будзе мець сучасных, простых і зразумелых формаў існавання, трансляцыі ў грамадстве, то не зможа развівацца самастойна. Культурная спадчына мае патрэбу ў сучаснай падачы для лёгкасці і даступнасці яе ўспрымання, бо многія традыцыі сфармаваліся ў сялянскім асяроддзі і становяцца менш зразумелыя сучаснаму чалавеку. Характэрнай асаблівасцю фальклорных калектываў з’яўляецца тое, што іх удзельнікі – у асноўным людзі старэйшага ўзросту. Дзяцей і моладзі ўдзельніче вельмі мала, таму з мэтай захавання фальклорных традыцый пажадана прыцягваць да ўдзелу як мага больш маладых людзей, дзяцей.

## АНАЛІЗ РАБОТЫ КАЛЕКТЫВАЎ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў ЖАНРЫ ХАРЭАГРАФІЧНАГА МАСТАЦТВА

Калектывы аматарскай харэаграічнай творчасці ажыццяўляюць сваю дзейнасць на базе дзяржаўных, прафсаюзных, ведамасных устаноў культуры, вышэйшых, сярэдніх спецыяльных, сярэдніх школ, устаноў дадатковай адукацыі.

По статыстычных дадзеных у 2024 годзе ў клубных установах Віцебскай вобласці дзейнічала: 250 харэаграфічных калектываў з колькасцю ўдзельнікаў 4304 чалавека; з іх 199 дзіцячых калектываў (3576 чалавек).

Аналіз работы харэграфічнага жанру за апошні год паказвае, што колькасць харэаграфічных калектываў расце, іх выканальніцкае мастэрства павышаецца. Неабходна павышаць выканальніцкае майстэрства харэаграфічных калектываў у новых накірунках, якія ўзніклі за апошнія гады: сучасны танец – (мадэрн, джаз, джаз мадэрн, свабодная пластыка, стэп, брэйк-данс, хіп-хоп, contemporary і г.д.); гісторыка-бытавыя танцы (танцы для правядзення баляў, такія як вальс, менуэт, бранль, паланэз, мазурка, полька, кракавяк і інш); артыстыстычны бальны танец, мажарэтны танец (спартыўны танец), шоў-праграмы і інш.

Колькасць калектываў са званнем ”Заслужаны“, найменнем ”народны“,”узорны“:

| | Міністэрства культуры | Міністэрства адукацыі | Прафсаюзныя калектывы |
|---|---|---|---|
| Заслужаны | 7 | | 2 |
| Народны | 1 | 1 | 1 |
| Узорны | 27 | 20 | 3 |

Найбольш добра харэаграфічны жанр развіваецца ў Аршанскім, Полацкім, Верхнядзвінскім, Лепельскім, Глыбоцкім, Талачынскім раёнах, г.Наваполацк, г.Віцебск. У параўнанні з папярэднімі гадамі ўзрасла колькасць харэаграфічных калектываў у Докшыцкім, Лёзненскім, Шумілінскім раёнах.

Няма харэаграфічных калектываў з найменнем ”народны/ўзорны“ ў Міёрскім, Сенненскім, Шаркаўшчынскім, Бешанковіцкім, Расонскім, Лёзненскім, Пастаўскім, Ушацкім раёнах.

У Сененнскім, Расонскім і Чашніцкім раёнах слаба развіваецца харэаграфічны жанр, асноўнай праблемай з’яўляецца тое, што у рэгіёне бачны кадравы недахоп спецыялістаў па харэаграфіі і акампаніятараў.

Па выніках прадстаўленых справаздач раёнаў/гарадоў вобласці за 2024 год у вобласці па стане на 01.01.2025 г. працавалі калектывы розных харэаграфічных жанраў:

1. Народна-сцэнічны танец;
2. Сучасны танец;
3. Эстрадны танец;
4. Спартыўна-бальны танец;
5. Вакальна-харэаграфічны;
6. Ансамблі барабаншчыц і мажарэтак;
7. Побытавы-фальклорны танец;
8. Ансамблі ўсходняга танца;
9. Класічны танец.

”Заслужаны“, ”народныя“ і ”ўзорныя“ харэаграфічныя калектывы:

Ансамблі народнага танца - 25
Ансамблі спартыўнага бальнага танца - 7
Студыі сучаснай харэаграфіі - 5
Ансамблі эстраднага танца - 20
Ансамбль класічнага танца - 1
Ансамбль барабаншчыц і мажарэтак -3
Ансамбль харэаграфічных мініяцюр - 1
Вакальна-харэаграфічны ансамбль - 7

Можна адзначыць, што папулярнымі напрамкамі работы калектываў з’яўляюцца народны, эстрадны, сучасны танец, фальклорны побытавы танец і ансамблі мажарэтак і барабаншчыц.

У раёнах вобласці праводзяцца раённыя агляды-конкурсы харэаграфічных калектываў, майстар-класы па развучванню традыцыйных беларускіх танцаў і свае мясцовыя турніры побытавых танцаў, семінары-практыкумы для кіраўнікоў танцавальных калектываў. Напрыклад, фальклорны калектыў ”Жывая спадчына“ Тулаўскага СДК Віцебскага раёна (кіраўнік Марына Яско) актыўна папулярызуе сярод вясковага і гарадскога насельніцтва танцы і гульні, праводзіць экспедыцыі, займаецца вывучэннем народнага касцюма. За год развучана вялікая колькасць танцаў, не толькі бытаваўшых у межах Віцебскага раёна, але ж і ў іншых рэгіёнах Беларусі.

З мэтай папулярызацыі, аднаўлення і захавання беларускіх побытавых танцаў, развіцця фальклорнага руху, стварэння новых і падтрымцы дзейнасці існуючых фальклорных і харэаграфічных калектываў установаў культуры ДУК ”Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці” ў верасні 2024 года на адкрытай канцэртнай пляцоўцы г.Талачына адбыўся II рэгіянальны турнір нацыянальных танцаў ”Танчым па-Талачынску“. Танцавальныя пары прадставілі мясцовыя варыянты праграмных танцаў з захаваннем адметнага стылю выканання. На базе ДУК ”Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“ пачала працу школа фальклорнага танца ”Талачынскія закаблукі“ (кіраўнік Таццяна Спаткай). На працягу года было паказана 8 майстар-класаў па танцах ”Крыўлянская кадрыля“, ”Чарнавусы Каралёк“, ”Рамашкаўская Лявоніха“. 27 красавіка на базе ДУК ”Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“ адбылося раённае свята ”Хрустальный башмачок-2024“, у якім прымалі ўдзел харэаграфічныя калектывы раёна. Для кіраўнікоў харэаграфічных калектываў установаў культуры метадыстамі арганізацыйна-метадычнага аддзела ДУК ”Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“ былі праведзены семінары-практыкумы на тэмы: ”Стварэнне сцэнічнага вобраза. Пастаноўка парнага, сольнага, сюжэтнага канцэртнага нумара“, ”Танцавальны фальклор свайго рэгіёна“, ”Абрадавая культура Беларусі“.

Паспяхова прадаўжаюць сваю працу народны тэатр фальклору ”Цярэшка“ і дзіцячы калектыў ”Бульбашыкі“ Глыбоцкага Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці: народныя побытавыя танцы дэманструюць на Міжнародным свяце ”Вішнёвы фестываль“, раённым свяце ”Квітней, Глыбоччына!“ і інш. Работнікамі Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці, сельскімі работнікамі культуры арганізавана 14 экспедыцый па вывучэнні мясцовага фальклору. На працягу года вывучаліся: традыцыйная абраднасць старавераў, пазаабрадавая танцы.

Раённы турнір беларускіх побытавых танцаў “Танцуй не лянісь” – праводзіцца ў Лёзненскім раёне.

Калектывы аматарскай мастацкай творчасці харэаграфічнага жанру Гарадоцкага раёна, што працуюць у сельскіх клубных установах, прынялі ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе народнай творчасці ”Гарадоцкая скарбонка-2024“.

Дванаццаць моладзевых пар прадставілі свае ўстановы на гарадскім балі ”Пад гукі паланэза“, які стаў традыцыйным у горадзе Докшыцы. Стала ўжо традыцыйным у Докшыцах свята нацыянальнай культуры ”Зберагаем вытокі свае“, якое праводзіцца ў аграгарадку Таргуны. У межах гэтага свята аддзелам традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці быў арганізаваны раённы агляд-конкурс фальклорнага мастацтва ”З крыніц спрадвечных“. У фальклорным накірунку працуе танцавальны калектыў Валкалацкага СДК, якія вядомы не толькі ў Докшыцкім раёне, але і за яго межамі. Кожны год танцавальныя пары бяруць удзел у Міжнародным турніры нацыянальных танцаў ”Танчым разам“, што праходзіць у межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“. Радуе тое, што свой вопыт, сваё майстэрства танцавальны калектыў Валкалацкага сельскага Дома культуры перадае падрастаючаму пакаленню. Побытавыя танцы ў выкананні дзяцей можна ўбачыць на шматлікіх мерапрыемствах, што арганізуе дадзеная ўстанова.

Дзеля захавання і папулярызацыі мясцовай танцавальнай спадчыны ў раёнах вядзецца праца з носьбітамі танцавальнай спадчыны, збіраюцца матэрыялы.

На працягу справаздачнага года харэаграфічныя калектывы актыўна прымалі ўдзел у значных мерапрыемствах вобласці, рэспублікі і за яе межамі. Гэта святочны канцэрт-цырымонія ўшанавання лаўрэатаў звання ”Чалавек года Віцебшчыны“, Рэспубліканскі конкурс ”Беларусь – мая песня“ (Палац Рэспублікі, г.Мінск), гала-канцэрт майстроў мастацтва для ўдзельнікаў XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ”Судьба у нас одна, и в этом наша сила“, гала-канцэрт ”Время выбрало нас“ у межах Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі ”Марафон единства“ (г.Мінск, г.Віцебск, г.Орша), абласны патрыятычны форум ”30 гадоў Пад знакам якасці“, прысвечаны 30-годдзю Інстытута прэзідэнцтва ў Рэспубліцы Беларусь, святочныя канцэрты, прысвечаныя Дню абаронцаў Айчыны, Дню жанчын, Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Дню яднання Беларусі і Расіі, Дню міліцыі, Дню Перамогі, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дню пажылых людзей, дабрачынныя канцэрты, а таксама абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі ”Дажынкі – 2024“ (г.п.Бешанковічы, г.Полацк), канцэртныя праграмы, конкурсы і мерапрыемствы XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“.

Ансамблі барабаншчыц і мажарэтак Віцебскай вобласці з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў featuredрознага ўзроўню, Калектывы ўражваюць арыгінальнасцю і неардынарнасцю нумароў, з’яўляюцца сапраўднай школай эстэтычнага выхавання для дзяцей і падлеткаў. Ансамблі барабаншчыц і мажарэтак – пастаянныя ўдзельнікі святаў і фестываляў, шматразовыя пераможцы міжнародных конкурсаў і аглядаў: Міжнароднага фестывалю-конкурсу барабаншчыц і мажарэтак (г.Віцебск); Міжнароднага фестывалю-конкурсу мажарэтак ”Зимние узоры“ (г.Масква); Міжнароднага

анлайн-конкурсу ”Янтарный парад“ (г.Калінінград); Міжнароднага турніру па спартыўных танцах ”Віцебская сняжынка“ і Рэспубліканскага конкурсу ансамбляў бальнага танца ”Майскі баль“ (г.Віцебск) у намінацыі ”акрабатычны танец (мажарэткі)“.

З мэтай папулярызацыі і далейшага развіцця кірунку ”мажарэтны танец“ у горадзе і вобласці (стварэнне калектываў барабаншчыц і мажарэтак у вобласці), умацавання міжнародных сувязяў у вобласці харэаграфічнага мастацтва і мажарэт-спорту, павышэння прафесійнага ўзроўня кіраўнікоў калектываў, мастацкага ўзроўня рэпертуару калектываў, а таксама выканальніцкага майстэрства ўдзельнікаў, знаёмства і згуртавання калектываў, абмену вопытам паміж педагогамі і выканаўцамі адбыўся абласны семінар-практыкум для кіраўнікоў ансамбляў барабаншчыц і мажарэтак устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны, арганізатарам якога выступіў Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці.

На працягу апошніх некалькіх год старшыня Федэрацыі Батон Твірлінга і Мажарэтак Расійскай Федэрацыі Вайцяхоўская Ірына Валянцінаўна (г.Масква) з’яўляецца старшынёй журы Міжнароднага фестывалю-конкурсу сярод мажарэтак і барабаншчыц у межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“ і дае майстар-класы і відэа-заняткі па правілах ФБТМ і MWF для кіраўнікоў калектываў барабаншчыц і мажарэтак Віцебскай вобласці.

Калектывы бальнага танца пастаянна ўдзельнічаюць у міжнародных, рэспубліканскіх, абласных конкурсах і фестывалях па спартыўных бальных танцах, а таксама з’яўляюцца актыўнымі удзельнікамі шматлікіх гарадскіх і раённых мерапрыемстваў: Міжнароднага турніру па спартыўных танцах ”Віцебская сняжынка“; адкрытых абласных турніраў па спартыўных танцах ”Winter Stars“, ”Stella Stars“ (г.Віцебск); Рэспубліканскага конкурсу ансамбляў бальнага танца ”Майскі баль“ (г.Віцебск); Першынства Віцебскай вобласці па спартыўных танцах; Міжнароднага турніру па спартыўных бальных танцах ”Gomel Open“ (г.Гомель); Рэспубліканскага конкурсу спартыўнага танца ”Кубак Восені“ (г.Мінск); адкрытага абласнога турніру па спартыўных танцах ”CUP OF WINNERS“ (г.Полацк); адкрытага абласнога турніру па спартыўных танцах ”Вясна ідзе – 2024“ (г.Віцебск) і інш.

На працягу 2024 года для развіцця харэаграфічнага жанру ДУ ”Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці“ былі рэалізаваны такія творчыя праекты, як XI Міжнародны турнір нацыянальных танцаў ”Танчым разам“ у рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“, III адкрыты абласны конкурс народнага танца ”Паазерскія тапаткі“ ў рамках Міжнароднага свята традыцыйнай культуры ”Браслаўскія зарніцы“ (г.Браслаў); XI абласны агляд-конкурс харэаграфічных калектываў ”Прыдзвінскія карункі“, прысвечаны Заслужанаму дзеячу культуры Беларусі І.А.Серыкаву (г.Гарадок), VI Міжнародны фестываль-конкурс барабаншчыц і мажарэтак у рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“, III абласны фестываль вулічнага мастацтва ”Волаты Прыдзвіння“

(вулічныя танцы).

Упэўнена працуюць дзіцячыя фальклорныя калектывы, якія ў 2024 годзе прымалі ўдзел у XV абласным аглядзе-конкурсе фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі ”Ад прашчураў да зор“ (турнір танцаў).

У ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ створана відэатэка з канцэртнымі праграмамі харэаграфічных калектываў са званнем ”заслужаны“, найменнямі ”народны“, ”узорны“. Сабраны відэаматэрыялы з абласных аглядаў-конкурсаў па харэаграфіі: ”Прыдзвінскія карункі“, ”Паазерскія тапаткі“, Міжнароднага фестывалю-конкурсу барабаншчыц і мажарэтак, турніру побытавых танцаў, семінараў і інш.

Харэаграфічныя калектывы не спыняюцца на дасягнутым, удасканальваюцца, шукаюць новыя формы і ўвасабляюць іх у сваёй творчасці.

## РАЗВІЦЦЁ ТЭАТРАЛЬНАГА ЖАНРУ

Тэатральная творчасць як арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці.

У 2024 годзе ў Віцебскай вобласці ў сферы культуры налічвалася **1946** аматарскіх калектываў мастацкай творчасці, з іх **377** калектываў тэатральнага жанру (з якіх **178** – для дзяцей), што складае **19,4%** ад агульнай колькасці калектываў. У вобласці ў розных сферах дзейнасці **576** калектываў маюць найменне ”народны“, ”узорны“ і званне ”Заслужаны“, з іх **90** тэатральнага жанру, якія прадстаўлены драматычнымі калектывамі, тэатрамі мініяцюр, тэатрамі гульні, тэатральнымі студыямі, лялечнымі тэатрамі, тэатрамі буфанады і інш., а менавіта: **64** калектывы з найменнем ”народны“, **24** – ”узорны“ і **2** са званнем ”Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь“.

З мэтай стымулявання і актывізацыі сацыякультурнай дзейнасці аматарскіх калектываў і іх мастацкіх кіраўнікоў у вобласці ў 2024 годзе арганізаваны і праведзены наступныя конкурсы для тэатральных калектываў:

**абласны агляд-конкурс ”Тэатральная вясна – 2024“, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў,** праводзіўся ў мэтах падтрымкі тэатральнага мастацтва; выкарыстання магчымасцяў аматарскіх калектываў па стварэнні найбольш яркіх, самабытных і таленавітых тэатральных праектаў; павышэння прафесійнага ўзроўню і распаўсюджвання творчага вопыту; пашырэння і ўмацавання культурных творчых сувязяў і супрацоўніцтва);

**абласная абменная акцыя ”Тэатральныя сустрэчы“, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў,** праводзіўся з мэтай пашырэння культурнага абслугоўвання сельскіх устаноў культуры, усталявання культурных сувязяў, далейшага росту і развіцця тэатральнага жанру, павышэння мастацкага ўзроўню аматарскіх театральных калектываў;

**абласны відэа-праект ”Літаратурна-музычны марафон ”Нам мир завещано беречь“** з удзелам літаратурна-музычных калектываў, студый праводзіўся ў мэтах актывізацыі работы літаратурна-музычных калектываў, студый; развіцця патрыятызму і грамадзянскасці ў падрастаючага пакалення; выхавання неабыякавага стаўлення да гістарычнага мінулага сваёй Радзімы;

**адкрыты конкурс традыцыйных батлеечных калектываў ”Батлейка Патупчыка запрашае“ ў межах Рэспубліканскага фестывалю сяброўства і мастацтва ”Две реки“** праводзіўся ў мэтах развіцця і адраджэння нацыянальных традыцый беларускай батлейкі, выяўлення і стымулявання дзейнасці аматарскіх тэатральных калектываў, рэжысёраў, выканаўцаў, мастакоў, працуючых у жанры тэатра лялек, стварэння новых батлеечных калектываў. Доказам жыццяздольнасці гэтай часткі беларускай тэатральнай культуры з’яўляецца дзейнасць 13 батлеечных калектываў вобласці, якія працягваюць і развіваюць традыцыі старажытнага народнага лялечнага тэатра Беларусі. Кожны год батлеечная скарбонка папаўняецца новымі калектывамі ў сферы культуры, якія аднаўляюць і захоўваюць традыцыі беларускай культуры. Гэта батлеечныя калектывы: ”Капялюш“ г.Наваполацк, ”Докшыцкая батлейка Патупчыка“ г.Докшыцы, ”Скарбонка“ г.п.Шаркаўшчына, ”Батлейка“ г.п.Арэхаўск (Аршанскі раён), ”Добрыя мыслі“ аг.Дабрамыслі і г.п.Лёзна (Лёзненскі раён), ”Сенненская батлейка“ г.Сянно, ”Бешанковіцкая батлейка“ г.п.Бешанковічы, ”Тэатрум“ г.Глыбокае, ”Браслаўская батлейка“ г.Браслаў, ”Дубровенская батлейка“ г.Дуброўна, ”Шумілінская батлейка“ г.п.Шуміліна, ”Лепельская батлейка“ г.Лепель. У 2024 годзе ў межах Рэспубліканскага фестывалю мастацтваў ”Беларусь – мая песня“ ў г.Мінск пры выступленні ў Палацы Рэспублікі творчых калектываў Віцебскай вобласці пры вызначэнні канцэпцыі канцэрта была ўзята ідэя і асноўная сюжэтная лінія ”Віцебскай батлейкі“. У наш час традыцыйны лялечны тэатр ”батлейка“ знаходзіцца на хвалі папулярнасці. Калі раней яго пастаноўкі былі ў асноўным на рэлігійную, і ў прыватнасці біблейскую тэматыку, то цяпер ён развіваецца, як дзіцячы і калядны тэатр. ”Батлейка“ ўяўляе вялікую цікавасць у гледачоў, як сведчанне адметнай мясцовай спадчыны, захаванне якой спрыяе культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека. Яна можа эфектыўна рэалізоўваць свой этнакультурны патэнцыял і існаваць у кантэксце розных кірункаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Беларусі;

**абласны конкурс гульнявых праграм ”Вясёлкавы карагод“ у межах абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі Віцебскай вобласці ”Дажынкі – 2024“** праводзіўся ў мэтах дэманстрацыі магчымасцяў і патэнцыялу гульні, адраджэння, захавання і папулярызацыі традыцый нацыянальнай гульнявай культуры і прадугледжваў выкананне наступных задач: павышэнне прафесійнага ўзроўню і творчага майстэрства культарганізатараў; папулярызацыя новых форм і ідэй у арганізацыі актыўнага адпачынку розных узроставых груп насельніцтва; распаўсюджванне лепшага творчага вопыту па гульнявай дзейнасці.

У дзейнасці тэатраў гульні можна адзначыць наступнае: кіраўнікам не хапае эксперыментальнасці і творчага пошуку, няма імкнення да набыцця

свайго адметнага творчага аблічча. З другога боку, пагоня за моднымі з’явамі шоў-бізнесу, за растыражаванымі ўзорамі поп-індустрыі і арыентацыя на непатрабавальны густ масавага гледача часта зніжае культурна-эстэтычную каштоўнасць творчай дзейнасці (напрыклад, правядзенне праграм да замежных святаў – Хэлоўін, Холі і г.д.). Культурная палітыка ў рэгіёнах вобласці патрабуе сёння пераасэнсавання практыкі правядзення розных праграм і мерапрыемстваў, накіраваных на дзейсную падтрымку народнай творчасці.

У 2024 годзе ў сувязі з тым, што літаратурныя клубы аматараў паэзіі, драмы, літаратурна-музычныя гасцёўні і інш. вызначыліся з прыярытэтным жанрам свайго існавання і сталі паўнацэннымі творчымі калектывамі, наяўнасць тэатральных калектываў стала пашырацца. Гэтыя калектывы актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах рознага маштабу: праводзяць канцэртныя, тэматычныя, тэатралізаваныя, літаратурныя праграмы і сустрэчы, супрацоўнічаюць з рознымі катэгорыямі насельніцтва.

Тэатральныя калектывы – актыўныя ўдзельнікі творчага жыцця Віцебшчыны, ні адно мерапрыемства не абыходзіцца без іх удзелу. Аб гэтым сведчыць наяўнасць яркіх тэатральных пастановак, выразных формаў канцэртных праграм і разнастайнасць рэпертуару. У рэпертуары аматарскіх тэатраў назіраецца цікавасць да п’ес сучасных аўтараў, засваенне складаных драматычных твораў класікаў, інсцэніраванне айчынных літаратурных твораў. Надаецца ўвага да выдання метадычных сборнікаў і рэкамендацый для кіраўнікоў калектываў, правядзення стажыровак, майстар-класаў, метадычных дзён і г.д.

Разам з тым, ёсць шэраг праблем, якія патрабуюць увагі. Трэба адзначыць, што творчае развіццё калектываў, іх стан напрамую залежаць ад зацікаўленасці з боку кіраўніцтва. Там, дзе разумеюць важнасць і неабходнасць існавання і ўдзелу калектываў у фестывалях, конкурсах, абменных акцыях і інш., адразу відаць узровень далейшага развіцця калектываў. Тут жа ўзнікаюць пытанні аб недастатковай ўкамплектаванасці прафесійнымі кадрамі ў раённых цэнтрах і на вёсцы, недастатковай рэпетыцыйнай рабоце, павышэнні кваліфікацыі кіраўніка калектыву, стварэнні сцэнічнага іміджу, набыцці сцэнічных касцюмаў, рэквізіту і неабходнага абсталявання для рэалізацыі творчых праектаў, магчымасцях кіраўніка падабраць правільны рэпертуар і адапціраваць яго з улікам выканальніцкага вопыту ўдзельнікаў і інш.

Аналізуючы работу ”народных“, ”узорных“ тэатральных калектываў вобласці, можна заўважыць іх творчы рост і запатрабаванасць. Валодаючы высокім узроўнем выканальніцкага майстэрства, аматарскія тэатральныя калектывы вобласці здзяйсняюць культурна-творчую дзейнасць, карыстаюцца папулярнасцю ў насельніцтва. Яны прадстаўляюць вобласць і рэспубліку на прэстыжных музычных акцыях і святах мастацтва не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі: на XXV Міжнародным Бранцаўскім фестывалі дзіцячых тэатральных калектываў (г.Санкт-Пецярбург) Рэспубліку Беларусь прадстаўляў узорны тэатральны калектыў ”Форум“ ДУА ”Дзіцячая школа мастацтваў г.Гарадка імя І.А.Серыкава“; XXXIII Міжнародным фестывалі мастацтваў

”Славянскі базар у Віцебску“; XXXVIII адкрытым фестывалі-конкурсе аўтарскай песні, паэзіі і візуальных мастацтваў ”Віцебскі лістапад“; XXXV Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі ў Віцебску; XXIII Маргарыцінскім кірмашу г.Архангельск (Расія); XVI Міжнародным фестывалі нацыянальных культур ”Сінягор'е“ (г.Чэлябінск, Расія); Рэспубліканскім конкурсе ”Юныя таленты Беларусі“ (УА ”Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр ”Зубраня“); XVIII Міжнародным фестывалі студэнцкіх і маладзёжных тэатраў ”Тэатральны куфар БДУ“ (г.Мінск) і шмат іншых.

Удзел аматарскіх тэатральных калектываў заўсёды ўпрыгожвае відовішчнае дзеянне, надае непаўторнасць і своеасаблівасць любому святу. Але трэба пашыраць і практыкаваць іх актыўнасць праз арганізацыю выязных праграм, прадстаўленняў, акцый, спектакляў і інш; стварэнне новых тэатральных калектываў, удзелу ў конкурсах і фестывалях.

На сённяшні дзень вельмі важна падтрымка аматарскага тэатральнага мастацтва – гэта адначасова і спрыянне развіццю прафесійнага тэатра. Гэта сілкуе яго новымі ідэямі і знаходкамі, а часта і будучымі акцёрамі. Выхаванцы клубных фарміраванняў тэатральнага жанру кожны год папаўняюць рады навучэнцаў і студэнтаў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў у рэспубліцы і за яе межамі. Выпускнікі гэтых устаноў з поспехам служаць у тэатрах дзяржаўнага ўзроўню і працуюць у клубных установах вобласці.

## РАЗВІЦЦЕ НАРОДНЫХ МАСТАЦКІХ РАМЁСТВАЎ У 2024 ГОДЗЕ

Па стане на 01.01.2025 года ў Віцебскай вобласці дзейнічаюць 24 дамы (цэнтры) рамёстваў і навукова-даследчая ўстанова культуры ”Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў“, якое фактычна выконвае функцыі дома рамёстваў. Агульная колькасць спецыялістаў дадзеных устаноў складае 176 чалавек. У параўнанні з 2023 годам спецыялістаў паменьшылася на 14 чалавек (у 2023 г. – 190).

Адраджэнне, развіццё і зберажэнне нацыянальнай культуры; перадача і папулярызацыя традыцыйных мастацкіх рамёстваў; эстэтычнае выхаванне розных катэгорый насельніцтва; папулярызацыя аб'ектаў нематэрыяльнай і матэрыяльнай культурнай спадчыны, збор прадметаў этнаграфіі, правядзенне даследчай і метадычнай работы; вывучэнне інфармацыі па рэгіянальных тэхніках і тэхналогіях рамёстваў – прыярытэтныя накірункі ў дзейнасці дамоў (цэнтраў) рамёстваў. Майстрамі народных мастацкіх рамёстваў вядзецца работа больш чым па 20 накірунках народнай творчасці.

На базе дадзеных устаноў у мэтах папулярызацыі вырабаў народнай творчасці ў 2024 годзе працавала 8 салонаў-магазінаў, што на 5 меньш, чым у 2023 годзе. Вялася работа ў 275 клубных фарміраваннях розных жанраў і

накірункаў: вакальна-харавыя, тэатральныя, музычна-інструментальныя, выяўленчыя, візуальныя, фальклорныя. У тым ліку для арганізацыі вольнага часу насельніцтва і падтрымкі развіцця сучаснай традыцыйнай культуры, вывучэння рэгіянальных тэхнік і тэхналогій вырабу прадметаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, далучэння людзей да актыўнай дзейнасці дзейнічала 148 калектываў дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

У параўнанні з 2023 годам за справаздачны час у дамах (цэнтрах) рамёстваў вобласці колькасць калектываў павялічылася на 6. Павялічылася на 210 чалавек і колькасць іх удзельнікаў: 2024 г. – 3 560 чал.; 2023 – 3 350 чал. Сярэдняя напаўняльнасць у 2024 годзе склала 12,9 чал.; у 2023 г. – 12,5 чал**.**

Гонарам з’яўляюцца 2 калектывы мастацкай творчасці, якія маюць званне ”Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь“ (Гарадоцкі, Лепельскі раёны), 2 – найменне ”узорны“ (Віцебскі раён, Шумілінскі раён) і 32 – ”народны“.

Лідэрамі па колькасці аб’яднанняў у жанры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з найменнем ”народны“, ”узорны“ з’яўляюцца Аршанскі і Полацкі раёны.

39 майстроў народных мастацкіх рамёстваў Віцебскай вобласці маюць статус ”Народны майстар Рэспублікі Беларусь“. У выніку плённай працы па адраджэнні і развіцці традыцыйных рамёстваў у 2024 годзе статус **”Народны майстар Рэспублікі Беларусь“** атрымалі 3 майстры народных мастацкіх рамёстваў: Размысловіч Таццяна Фёдараўна (Лепельскі раён); Залатуха Святлана Мікалаеўна (Лепельскі раён); Сарбаш Алеся Леанідаўна (Віцебскі раён).

Штогод ва ўстановах культуры выкарыстоўваюцца разнастайныя формы работы: свята беларускіх рамёстваў, абрад, вячоркі, дні адчыненых дзвярэй, вечар-партрэт, экскурсія, майстар-клас, забаўляльная праграма і інш. Важны накірунак работы спецыялістаў дамоў (цэнтраў) рамёстваў і клубаў (студый) майстроў народных мастацкіх рамёстваў – выставачная дзейнасць. Спецыялістамі ўстаноў арганізоўваюцца і праводзяцца гарадскія, раённыя выставы.

На базе дамоў (цэнтраў) рамёстваў за справаздачны перыяд праведзена 8 028 мерапрыемстваў. З найбольш значных трэба адзначыць мерапрыемствы **Гарадоцкага раёна:** XII адкрыты конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ”Ці знаў хто з вас, браткі, Тараса?“ і III раённы конкурс па лозапляценні ”Лазовы кош“. **У Віцебскім раёне** было арганізавана раённае свята народных мастацкіх рамёстваў ”Узоры майстэрства“, прысвечанае святу нацыянальнага арнаменту ”Дзень вышыванкі“. **Ва Ушацкім раёне** праведзена сумесная праца з дзіцячым садам №3 г.п.Ушачы, дзе работнікі Дома рамёстваў сумесна з выхавацелямі правялі гульню-конкурс ”Мамины помощники“ для выхаванцаў старэйшай групы. **Шумілінскі раён** да 80-годдзя вызвалення Шумілінскага раёна ад нямецка-фашыскіх захопнікаў падрыхтаваў выставу-панараму ”И снова к прошлому взглядом приблизимся…“. У **Лёзненскім раёне** па 5 напрамках вялася праектная дзейнасць: ”Рукадзельныя канікулы“,

”Маленькім беларусам пра вялікую Беларусь“, ”Беларуская батлейка запрашае“, ”Лямец па-Лёзненску“, ”Майстры і вучні“, ”Саламяны карагод“. **Шаркаўшчынскі раён** ажыццявіў культурна-мастацкі праект ”Пакуль жывуць традыцыі“. У мэтах захавання гістарычнай памяці і праўды аб Вялікай Айчыннай вайне **Сенненскі** Дом рамёстваў рэалізаваў культурны праект ”Подзвіг народа бессмяротны“. **У Чашніцкім раёне** працягваецца работа па рэалізацыі праекта ”Чашніцкія святыні. У пошуках страчанага“, якія прысвечаны захаванню і адраджэнню рукатворных ікон, якія існавалі на тэрыторыі Чашніцкага раёна з 20-х гадоў мінулага стагоддзя.

Вельмі значнымі ў дзейнасці дамоў (цэнтраў) рамёстваў з’яўляюцца абласныя мерапрыемствы, якія арганізоўвае дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (далей – АМЦНТ). Выставачная дзейнасць скіравана на стымуляванне творчай актыўнасці народных клубаў (студый) майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў, супрацоўнікаў дамоў (цэнтраў) рамёстваў. У 2024 годзе спецыялістамі аддзела традыцыйнай культуры АМЦНТ было арганізавана і праведзена 13 выстаў, якія прайшлі ў выставачнай зале АМЦНТ, а таксама 4 – у г.Мінску, 3 – г.Пскове, 1 – г.Маскве, 1 – г.Смаленску.

У выставачнай зале АМЦНТ працягваў сваю рэалізацыю праект ”У роднай хатцы“, удзел у якім прынялі майстры з усіх раёнаў Віцебскай вобласці і г.Віцебска. У межах рэалізацыі праекта адбылося тры абласных выставы-конкурсы па вясковаму і мястэчковаму інтэр’ернаму тэкстылю Віцебшчыны: ”У роднай хатцы на Віцебскім Падзвінні“, ”У роднай хатцы на Віцебскім Падняпроўі“ і ”У роднай хатцы на Паазер’і“; быў праведзены шэраг майстар-класаў з дэманстрацыяй тэхнік вырабу тэкстыльных твораў.

Абласная выстава, прысвечаная 85-годдзю АМЦНТ **”Праз прызму часу“** праходзіла з 23 сакавіка па 6 красавіка. На выставе былі прадстаўлены вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі рэгіянальнымі адметнасцямі; дэманстраваліся дасягненні ў развіцці традыцыйнай культуры, народных рамёстваў і фальклорнай спадчыны Віцебшчыны.

З мэтай агляду збораў (фондаў) артэфактаў этнаграфіі сучаснай Віцебскай вобласці і памежжа з 16 лютага па 2 сакавіка 2024 года ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ размяшчалася **абласная выстава артэфактаў ”Рэліквія“.** На выставе былі прадстаўлены артэфакты з 19 раёнаў, якія ў далейшым могуць стаць перспектыўнымі элементамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Віцебскай вобласці, узорам найлепшых праяў традыцыі рамяства, побытавых рэчаў ці твораў народнай творчасці для далейшага аднаўлення ці рэканструкцыі ў якасці брэнда рэгіёну. Удзел у выставе прынялі майстры народных мастацкіх рамёстваў дамоў (цэнтраў) рамёстваў Віцебскай вобласці Аршанскага, Бешанковіцкага, Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Віцебскага, Глыбоцкага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Лепельскага, Лёзненскага, Пастаўскага, Сенненскага, Талачынскага, Ушацкага, Шумілінскага раёнаў, г.Наваполацка і г.Віцебска.

З 10 красавіка па 4 мая 2024 года адбылася абласная выстава **набіванкі ”Віцебская набойка“** ў мэтах папулярызацыі мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі рэгіянальнымі адметнасцямі; папулярызацыі ў шырокіх глядацкіх колах традыцый набойкі (набіванкі) Віцебшчыны. На выставе дэманстраваліся вырабы высокага мастацкага ўзроўню ў тэхніцы ”набойка“: элементы касцюма, галаўныя ўборы, сурвэткі, абрусы, рушнікі і інш. Разам з творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва была прадстаўлена рэкламная і друкарская прадукцыя, метадычныя дапаможнікі, тэкставыя вынікі экспедыцый. Удзел у выставе прынялі майстры народных мастацкіх рамёстваў Віцебскага, Глыбоцкага, Гарадоцкага, Лепельскага, Лёзненскага, Пастаўскага, Полацкага, Сенненскага, Шумілінскага раёнаў, г.Наваполацка і г.Віцебска.

З 8 па 31 мая 2024 года прайшла **выстава-конкурс інсітнага мастацтва ”Пад мірным небам“, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.** Асноўная тэма выставы – лёс продкаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: сямейныя абрады і святы, паўсядзённае жыццё сям’і, вобразы навакольнага асяроддзя, жывёльнага і расліннага свету і многае іншае. У дадзеным конкурсе 70 удзельнікаў з 18 раёнаў і гарадоў вобласці прадставілі 168 работ у намінацыях па тэмах: ”Пад мірным небам“, ”Лёс продкаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны“, ”Сямейныя святы і традыцыі“, ”Партрэтныя вобразы“, ”Вобразы роднага краю“, ”Энвайранмент“. Не прынялі ўдзел: Докшыцкі, Сенненскі, Талачынскі, Шаркаўшчынскі раёны і г.п.Копысь Аршанскага раёна.

**Выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ”Віцебск у мініяцюры“, прысвечаная 1050-годдзю Віцебска,** была арганізавана ў мэтах папулярызацыі мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі рэгіянальнымі адметнасцямі; дэманстрацыі дасягненняў у развіцці дэкаратыўна-прыкладной творчасці дамоў (цэнтраў) рамёстваў. На выставе былі прадстаўлены вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія захоўваюць традыцыйны характар і маюць індывідуальны почырк мастака альбо майстра; вырабы з прыроднага альбо штучнага матэрыялаў, кампазіцыі і інсталяцыі, выкананыя ў розных тэхніках. Падчас адкрыцця выставы адбылася прэзентацыя каталога ”Акварэлі Ніны Федарыставай“ (14.06-06.07.2024).

Абласная выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **”Віцебск у мініяцюры“** ўяўляла сабой збор работ майстроў народных рамёстваў, жывапісцаў з АМЦНТ і ўсяго паўночнага рэгіёну, а таксама твораў навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў і студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава. Сярод прыкладна 150 экспанатаў большую частку займалі маляўнічыя палотны.

На базе АМЦНТ была арганізавана **абласная выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ”У люстэрку міфалогіі“** ў мэтах папулярызацыі мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі рэгіянальнымі адметнасцямі; папулярызацыі фальклорнай спадчыны, далучэння насельніцтва да вывучэння традыцый, гісторыі, культуры

Віцебшчыны – міфаў, легенд і паданняў. У конкурсе прынялі ўдзел майстры з 15 раёнаў вобласці, г.Наваполацка і г.Віцебска. Выстава прадэманстравала багацце і разнастайнасць беларускай міфалогіі. Мерапрыемства праходзіла па 5 намінацыях: ”Лепшая мастацкая выява“, ”Лепшая сюжэтная кампазіцыя альбо інсталяцыя“, ”Лепшая выява міфалагічнай істоты“, ”Лепшае міфалагічнае пудзіла“, ”Лепшая маска-выява міфалагічнай істоты“ (12.09-08.10.2024).

З 15 кастрычніка па 11 лістапада 2024 г. у выставачнай зале АМЦНТ адбылася **абласная выстава-продаж сувеніраў ”Дызайн – працяг традыцый“, прысвечаная Году якасці** ў мэтах папулярызацыі і агляду якасці ўтылітарнай, дэкаратыўнай і сувенірнай прадукцыі, створанай майстрамі народных мастацкіх рамёстваў, самазанятымі майстрамі-рамеснікамі Віцебскай вобласці.

На выставе былі прадстаўлены сувенірныя вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якіх адлюстраваны нацыянальныя традыцыі і рэгіянальныя асаблівасці тых ці іншых вырабаў, распаўсюджаных на тэрыторыі паўночнага краю. Яркія і самабытныя сувеніры выраблены ў розных тэхніках: саломапляценне, лозапляценне, разьба па дрэве, кераміка і ганчарства, ткацтва, роспіс па тканіне і шкле, выцінанка, апрацоўка скуры і многія іншыя.

Завяршыла выставачную дзейнасць 2024 года традыцыйная **выстава-кірмаш ”Калядны карагод“**, на якой майстры народных мастацкіх рамёстваў вобласці прадставілі прыкладна 2 тысячы дэкаратыўных вырабаў на тэму Раства, Каляд і Новага года: арыгінальныя елачныя цацкі, пано, карціны, магніты, саматканыя сурвэткі і сняжынкі, торбачкі, жаночыя ўпрыгожванні, гліняныя фігуркі і многае іншае.

Супрацоўнікамі АМЦНТ вядзецца пэўная работа па арганізацыі ўдзелу калектываў вобласці ў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах, святах, фестывалях, кірмашах і іншых мерапрыемствах.

З 2 па 26 лютага 2024 г. экспазіцыя самага паўночнага беларускага рэгіёну была прадстаўлена ў павільёне ”Рэспубліка Беларусь“ на выставе дасягненняў народнай гаспадаркі ў г.Маскве. Удзельнікамі выставачнага комплексу сталі больш за 50 артыстаў Віцебшчыны. У рамках міжнароднай выставы-форуму ”Расія“ прайшла маштабная прэзентацыя Віцебскай вобласці з удзелам майстроў народнай творчасці г.Віцебска, Глыбоцкага, Лепельскага, Лёзненскага, Сенненскага, Шумілінскага раёнаў, якія прадстаўлялі сваё майстэрства, праводзілі майстар-класы па традыцыйных відах рамёстваў: ткацтве паясоў, кераміцы і вышыўцы.

У **Рэспубліканскім фестывалі ”Беларусь – мая песня“** прынялі ўдзел майстры дамоў (цэнтраў) рамёстваў Аршанскага, Верхнядзвінскага, Віцебскага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Лепельскага, Пастаўскага, Расонскага, Чашніцкага, Шаркаўшчынскага раёнаў, г.Наваполацка і г.Віцебска (люты 2024 г., г.Мінск).

Праз удзел майстроў дамоў (цэнтраў) рамёстваў у **рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемствах** здзяйсняецца і папулярызацыя народных

мастацкіх рамёстваў Віцебскай вобласці: абменныя выставы работ майстроў народных мастацкіх рамёстваў паміж **Віцебскай і Смаленскай абласцямі**; **Віцебскай і Пскоўскай абласцямі**.

У жніўні 2024 г. у г.Пскове Расійскай Федэрацыі **ў рамках святкавання 80-годдзя ўтварэння Пскоўскай вобласці прайшлі дні Віцебскай вобласці**. Народную творчасць Віцебшчыны прадставілі майстры раённых дамоў (цэнтраў) рамёстваў Полацка, Гарадка, Верхнядзвінска і Віцебска (АМЦНТ).

У рамках **XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі** прайшлі выставачныя мерапрыемствы элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны з правядзеннем майстар-класаў (28.06.2024, г.Віцебск).

У верасні сумесна з Гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь арганізавана **экспанаванне выставачнага праекта ”Беларусь у рытме традыцый“**. Былі прадстаўлены экспанаты з фондаў АМЦНТ: адзенне, прадметы побыту і рамёстваў. Выстава экспанавалася ў дзяржаўнай аўтаномнай установе культуры Новасібірскай вобласці ”Новасібірскі дзяржаўны краязнаўчы музей“ у рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Новасібірскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

Традыцыйна майстры народных мастацкіх рамёстваў Віцебшчыны ўдзельнічалі ў **Рэспубліканскім свяце ”Купалле“ (”Александрыя збірае сяброў“)**, якое прайшло ў ліпені 2024 года ў Магілёўскай вобласці. На творчых пляцоўках працавалі майстры з Аршанскага, Віцебскага, Гарадоцкага, Докшыцкага, Дубровенскага, Сенненскага раёнаў.

У маі майстры з Аршанскага, Бешанковіцкага, Віцебскага, Гарадоцкага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Дубровенскага, Лепельскага, Міёрскага, Пастаўскага, Сенненскага, Ушацкага, Чашніцкага, Шаркаўшчынскага раёнаў і г.Віцебска паспяхова прынялі ўдзел у Рэспубліканскім кірмашы **”Вясновы букет“** у г.Мінску.

На працягу 2024 года супрацоўнікамі АМЦНТ былі праведзены:

2 **семінары-практыкумы** для супрацоўнікаў дамоў (цэнтраў) рамёстваў ”Віцебская набойка“ , ”Лапікавае шыццё: прыёмы і тэхналогіі“.

**V Міжнародны пленэр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, конкурс па ганчарству ”Гліна спявае“** сабраў майстроў-ганчароў і майстроў па кераміцы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку 3-х удзельнікаў са Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі (25-29.09.2024, г.п.Копысь, Аршанскі раён). На пленэры быў шырока прадстаўлены элемент НКС ”Традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных цацак Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння“. У конкурсе ”Гліна спявае“ ўдзельнічалі 19 майстроў, якія ў дзень адкрыцця пленэру прадставілі свае вырабы ў намінацыі ”Лепшая хатняя калекцыя“.

На працягу года рэалізоўваўся **сумесны праект АМЦНТ і ДУА ”Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ”Код майстэрства“,** у рамках якога адбыліся: семінары, выставы, майстар-класы для педагогаў, навучэнцаў гурткоў на базе Віцебскага АМЦНТ, арганізавана наведванне центра рамёстваў ”Адраджэнне“.

Шэраг мерапрыемстваў адбыўся з мэтай зберажэння і падтрымкі традыцыйнай культуры ў рамках XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“. З 11 па 14 ліпеня на вуліцы Пушкіна працаваў **кірмаш рамёстваў ”Горад майстроў“**. Свае вырабы прадставілі больш за 300 таленавітых рамеснікаў і мастакоў-аматараў з розных абласцей Беларусі, а таксама з Беларускага саюза майстроў народнай творчасці і з розных рэгіёнаў Расіі (Арэнбург, Масква, Пскоў, Уладзімір, Варонеж, Смаленск, Раслаўль, Вялікі Ноўгарад, Кабардзіна-Балкарыя, Тальяці).

З мэтай папулярызацыі элемента НКС ”Беларускія практыкі саломапляцення“ прайшло **V адкрытае абласное свята-конкурс майстроў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па саломапляценні ”Папараць-кветка“** з удзелам майстроў з абласцей Беларусі: Віцебскай, Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай. Гран-пры конкурсу атрымала студыя саломапляцення ДУ ”Культурна-гістарычны комплекс ”Залатое кола горада Віцебска ”Дзвіна“ (11-12.07.2024, г.Віцебск).

На **VI Міжнародным свяце-конкурсе традыцыйнай свістулькі ”Салавейка“** сваё майстэрства па стварэнні гліняных цацак прадставілі каля 40 удзельнікаў з усіх абласцей Беларусі, а таксама канкурсанты з Расіі. Увазе гледачоў была прадстаўлена традыцыйная і аўтарская свістулька, цацка кожнага рэгіёну. Конкурс праводзіўся па 8 намінацыях. Гран-пры конкурсу заваявала народная студыя майстроў народных мастацкіх рамёстваў ”Дубрава“ раённага Дома рамёстваў ДУК ”Раённы цэнтр народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскага раёна“ (13-14.07.2024).

12 ліпеня 2024 г. адбыўся Дзень нацыянальных культур краін-удзельніц Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Разам з іншымі краінамі на выставе элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны супрацоўнікамі АМЦНТ была прадстаўлена шматграннасць традыцый і звычаяў беларускага народа.

27 ліпеня 2024 года ў г.Глыбокае праведзена **абласная выстава-конкурс аўтарскіх і батлеечных лялек ”З запаветных дзіцячых сноў“ у рамках Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“.** На выставе былі прадстаўлены каля 100 аўтарскіх лялек і лялечных кампазіцый – работы таленавітых майстроў Віцебшчыны. Сваю творчасць прадставілі 17 майстроў па стварэнні лялек. Экспазіцыю выставы прадстаўлялі вырабы з дрэва, тканіны, воўны, паперы, пап’е-машэ і інш., у розных стылях і тэхніках стварэння аўтарскіх лялек і кампазіцый – ад класічных да сучасных, ад традыцыйных да эксклюзіўных арт-аб’ектаў. Гран-пры выставы-конкурсу атрымала Марына Лявонцьеўна Паўлюкевіч – ДУК ”Цэнтралізаваная клубная сістэма Браслаўскага раёна“.

21 верасня 2024 года ў рамках штогадовага экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“ адбылася **абласная інтэрактыўная выстава-конкурс мастацкіх вырабаў ”Птушыны перапалох“** з мэтай фарміравання высокай экалагічнай культуры; павышэння сацыяльнай актыўнасці ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя; уяўлення аб неабходнасці захавання прыроднага свету; прыцягнення ўвагі да праблемы аховы птушак; папулярызацыі і распаўсюджвання традыцыйных народных і мастацкіх вырабаў; адлюстравання

адзінства прыроды і чалавека ў мастацкай культуры. У мерапрыемстве прынялі ўдзел 74 майстры Віцебскай вобласці. Конкурсныя работы былі прадстаўлены ў наступных намінацыях: ”Лепшая шпакоўня для зімуючых птушак“, ”Лепшая выява птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі“, ”Лепшая мастацкая кампазіцыя з беларускіх птушак“ і ”Лепшая распрацоўка сувеніра да свята“.

**Абласная выстава-конкурс маляванкі ў межах абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі Віцебскай вобласці ”Дажынкі-2024“** праходзіла ў мэтах папулярызацыі мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі рэгіянальнымі адметнасцямі; папулярызацыі ў шырокіх глядацкіх колах традыцый маляванага дывана Віцебскага Паазер’я (элемента, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь); прыцягнення ўвагі моладзі да традыцыйнай культуры і творчасці вядучых майстроў маляванкі Віцебскай вобласці; фарміравання эстэтычнага густу насельніцтва на ўзорах творчасці майстроў, якія займаюцца вырабам маляваных дываноў (14 раёнаў-удзельнікаў).

Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА налічвае шэсць беларускіх элементаў. Элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны ”Выцінанка – традыцыйнае мастацтва выразання з паперы ў Беларусі“ 4 снежня 2024 г. уключана ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

23 снежня 2024 г. у Нацыянальным мастацкім музеі адбылося ўрачыстае мерапрыемства Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, прысвечанае ўключэнню выцінанкі ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Для ўручэння сертыфіката былі запрошаны майстры народных мастацкіх рамёстваў папяровай выразкі з усёй Рэспублікі Беларусь. Віцебскую вобласць з майстар-класам прадстаўляла носьбіт нематэрыяльна-культурнай спадчыны, загадчык сектара па выставачнай дзейнасці АМЦНТ Ганна Перліна. Падчас мерапрыемства папяровыя выразкі Г.Перлінай перададзены ў дар Нацыянальнаму мастацкаму музею. Адначасова з уручэннем сертыфіката адкрылася выстава выцінанкі, у якой прынялі ўдзел майстры з Глыбоцкага, Сенненскага, Шаркаўшчынскага раёнаў і г.Віцебска.

На базе Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту ў аг.Азярцо Мінскага раёна калектывы народнай творчасці і майстры г.Наваполацка, Лепельскага і Чашніцкага раёнаў прынялі ўдзел у мерапрыемствах з мэтай папулярызацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: ”Дзень Батлейкі. Традыцыйная калядная батлейка ”Віцебскі жлоб“ (24.02.2024); ”Практыкі саломапляцення“ (27.04.2024); ”Традыцыйная страва ”Клёцкі з ”душамі“ (02.112024).

Па выніках работы за 2024 год за адраджэнне традыцыйных рэгіянальных рамёстваў, рэканструкцыю рэгіянальных строяў адзення, актыўную экспедыцыйную і даследчую працу на месцах, удзел у мерапрыемствах трэба адзначыць дамы (цэнтры) рамёстваў Гарадоцкага, Глыбоцкага, Лепельскага, Лёзненскага, Пастаўскага, Сенненскага, Шаркаўшчынскага раёнаў і

г.Наваполацка, майстры якіх прынялі ўдзел амаль ва ўсіх выставах, арганізаваных АМЦНТ.

**Сумарны вынік удзелу майстроў мастацкіх рамёстваў у абласных мерапрыемствах (выставы, пленэры, конкурсы) у 2024 годзе**

| | Раён/горад | Колькасць мерапрыемстваў |
|---|---|---|
| 1 | Аршанскі | 10 |
| 2 | Бешанковіцкі | 11 |
| 3 | Браслаўскі | 7 |
| 4 | Верхнядзвінскі | 10 |
| 5 | Віцебскі | 11 |
| 6 | Гарадоцкі | 14 |
| 7 | Глыбоцкі | 11 |
| 8 | Докшыцкі | 5 |
| 9 | Дубровенскі | 14 |
| 10 | Лепельскі | 11 |
| 11 | Лёзненскі | 10 |
| 12 | Міёрскі | 10 |
| 13 | Пастаўскі | 13 |
| 14 | Полацкі | 11 |
| 15 | Расонскі | 10 |
| 16 | Сенненскі | 11 |
| 17 | Талачынскі | 9 |
| 18 | Ушацкі | 10 |
| 19 | Чашніцкі | 8 |
| 20 | Шаркаўшчынскі | 10 |
| 21 | Шумілінскі | 10 |
| 22 | г.Новаполацк | 12 |
| 23 | г.Віцебск | 14 |

Нягледзячы на тое, што вядзецца актыўная работа па адраджэнні і зберажэнні нацыянальнай традыцыйнай культуры Віцебскай вобласці, **выяўляецца і шэраг праблем**.

Вялікую ўвагу дамы (цэнтры) рамёстваў павінны надаваць фарміраванню пазітыўнага грамадскага меркавання аб сваёй дзейнасці і выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі для папулярызацыі сваёй дзейнасці: весці старонкі ў сацыяльных сетках, выкарыстоўваць відэахосцінгі. Майстрам традыцыйных рамёстваў трэба надаць увагу нацыянальным традыцыям; вывучаць і даследваць экспанаты з фондаў раённых музеяў, а таксама звярнуць увагу на сваю галоўную мэту: захоўваць, развіваць і папулярызаваць традыцыйныя каштоўнасці.

Для распаўсюджвання і папулярызацыі традыцыйных рамёстваў арганізаваць онлайн-навучанне, аказваць метадычную дапамогу ў відзе друкаваных выданняў па пытаннях народных рамёстваў і дэкаратыўнага мастацтва зацікаўленаму насельніцтву.

Ажыццяўляць супрацоўніцтва з турыстычнымі фірмамі.

Клубам народных майстроў народных мастацкіх рамёстваў, якія пацвярджаюць найменне ”народны“, ”узорны“ і званне ”Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь“, трэба больш адказна падыходзіць да правядзення справаздачных выстаў: прадстаўленыя на іх творы павінны адпавядаць асноўным крытэрыям – мець традыцыйную накіраванасць, адказваць высокаму ўзроўню выканання; быць створанымі майстрамі за апошнія тры гады дзейнасці клуба.

Неабходна звярнуць увагу кіраўніцтву дамоў (цэнтраў) рамёстваў на ўдзел у колькасці ажыццяўляемых выстаў і мерапрыемстваў, у тым ліку на базе АМЦНТ, якія з’яўляюцца значнымі для майстроў народных мастацкіх рамёстваў, і ўдзел у іх павінен быць максімальна актыўным. Трэба звярнуць увагу і на правільнасць афармлення заявак і спісаў да ўдзелу ў мерапрыемствах: прозвішча і імя майстра павінны быць поўнымі і на беларускай мове, прыклад дадаецца да кожнага палажэння мерапрыемства, рабіць экспазіцыйныя этыкеткі трэба з кардону і замацоўваць на творы самастойна.

## АНАЛІЗ ДЗЕЙНАСЦІ АМАТАРСКІХ АБ’ЯДНАННЯЎ І КЛУБАЎ ПА ІНТАРЭСАХ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ва ўстановах культуры клубнага тыпу Віцебскай вобласці ў 2024 годзе плённа працавала 2 652 клубных фарміравання (на 43 больш, чым у 2023 г.). У тым ліку, згодна інтэграванай базе дадзеных па стане на 01.01.2025 года, дзейнічала 587 аматарскіх аб’яднанняў, што на 10 менш, чым на 01.01.2024 г. (2023 г. – 597), колькасць удзельнікаў – 7 716: на 61 удзельніка больш, чым у 2023 г. (2023 г. – 7 655 чал.); з іх 195 аб’яднанняў дзейнічала для дзяцей і падлеткаў, што на 11 менш, чым у 2023 г. (2023 г. – 206) колькасць удзельнікаў – 2 266: на 206 удзельнікаў менш, чым у 2023 г. (2023 г. – 2 472 чал.). 1 калектыў мае найменне ”народны“.

Высокія паказчыкі па колькасці аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах назіраюцца ў наступных раёнах: Докшыцкі – 48, Аршанскі – 46, Віцебскі – 46, Верхнядзвінскі – 38, Браслаўскі – 37, Лепельскі – 35, Полацкі – 33, Чашніцкі – 31. Нізкая колькасць у Лёзненскім раёне – 11, Гарадоцкім – 13, Глыбоцкім – 13.

Па накірунках дзейнасці найбольш распаўсюджаны: клубы ветэранаў і клубы пажылых людзей, літаратурныя аб’яднанні і клубы, гістарычныя клубы і клубы гістарычнай рэканструкцыі, клубы майстроў і клубы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, клубы нацыянальнай кухні, гульні і фальклору,

жаночыя, сямейныя клубы, клубы выхаднога дня, клубы прыродазнаўчага накірунку, клубы аматараў здаровага ладу жыцця, гульнёвыя клубы, шматпрофільныя клубы і іншыя.

Асноўнай аўдыторыяй аматарскіх аб’яднанняў з’яўляюцца дарослыя, якія складаюць 70,6% з агульнай колькасці ўдзельнікаў і толькі 29,4% удзельнікаў – дзеці. У шэрагу ўстаноў культуры клубнага тыпу развіваюцца аматарскія аб’яднанні і клубы па інтарэсах сучаснага накірунку (посткросінг, блогінг, шматлікія фота-, кіна- і дыскаклубы, клубы інструментальнай музыкі, патрыятычныя, інтэлектуальныя клубы і іншыя). Напрыклад, клуб аматараў інструментальнай музыкі ”Вясковыя мажорыкі“ (Лепель), фотаклубы (г.Наваполацк), дыскаклуб (Шумілінскі раён), клуб ”Акадэмія блогераў“ (Докшыцкі раён), клубы посткросінга (Докшыцкі і Пастаўскі раёны) і інш.

У 2024 годзе пачалі сваю працу 75 новых аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах (2024 г. – 56): клуб лапікавага шыцця ”ЛоскутОк“ (г.Віцебск), клуб выхаднога дня ”Отдохнем“ (Міёрскі раён), клуб аматараў актыўнага адпачынку ”Юніёры“ (Полацкі раён), аматарскае аб’яднанне ”Здаровае пакаленне“ (Шаркаўшчынскі раён), аматарскае аб’яднанне ”На досуге“ (Ушачы), аматарскае аб’яднанне “Изгиб” (Докшицы).

Два калектывы створаны ў г.Наваполацку: клуб інтэлектуальнай гульні “Мафия” і творчая майстэрня ”Лёля“.

Тры калектывы ў Шумілінскім раёне: калектыў па пляценню з кары ”Прырода і фантазія“, дыскаклуб, калектыў рухомай гульні, і тры аматарскія аб’яднанні ў Глыбоцкім раёне: ”Белый мяч“, ”Теннис тайм“, ”Ударный успех“.

Чатыры – ў Браслаўскім раёне: клуб ігры на гітары, клуб ”Траўнік“, аматарскае аб’яднанне ”Таямніцы Друі“, аматарскае аб’яднанне ”Клуб дзіцячай творчасці“.

Сем аматарскіх калектываў у справаздачным годзе былі арганізаваны ў Дубровенскім раёне: калектыў народнай творчасці ”Беларускі сувенір“, гісторыка-патрыятычны калектыў ”Рубеж“, аматарскае аб’яднанне ”Ладушки“, аматарскае аб’яднанне ”Девчата“, аматарскае аб’яднанне ”Серебряный возраст“, аматарскае аб’яднанне ”Эрудит“, аматарскае аб’яднанне ”Подружки“.

Новыя аматарскія калектывы і клубы па інтарэсах створаны і ў наступных раёнах: Аршанскім – 4, Чашніцкім – 4, Верхнядзвінскім – 8, Шаркаўшчынскім – 10, Лепельскім – 10.

Найбольшай колькасцю калектываў папоўніліся ўстановы культуры Віцебскага раёна – 14.

На працягу 2024 года амаль ва ўсіх дзяржаўных установах культуры Віцебскай вобласці з мэтай паляпшэння дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах праведзены раённыя семінары і практыкумы. У рамках семінараў разгледжаны пытанні па пашырэнні напрамкаў дзейнасці дадзеных фарміраванняў; роля дзіцячых аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах у сучасным сацыякультурным жыцці падрастаючага пакалення; спецыфіка стварэння сямейных клубаў ва ўстановах культуры. Разгледжаны пытанні па паслядоўнасці арганізацыі працы, па запаўненню дакументацыі, распрацоўцы

вучэбна-выхаваўчых планаў работы. На семінарах работнікі ўстаноў культуры абменьваліся вопытам і падвадзілі вынікі арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці.

Так, напрыклад, на тэму ”Любительские объединения, клубы по интересам и их роль в современной жизни“ праведзены семінар ва Ушацкім раёне, на якім былі разгледжаны пытанні: асноўныя мэты і задачы дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў, клубаў па інтарэсах; роля аматарскіх аб’яднанняў, клубаў па інтарэсах у сучасным жыцці; афармленне дакументацыі па аматарскіх аб’яднаннях; работа ў праграме Microsoft PowerPoint (складанне прэзентацыі); планаванне дзейнасці клубных фарміраванняў (з досведу працы ўзорнага фальклорнага калектыву ”Спадчына“).

На базе Шаркаўшчынскага раённага Цэнтра культуры адбыўся семінар для работнікаў клубных устаноў культуры і кіраўнікоў дзіцячых калектываў, у тым ліку і для дзіцячых аматарскіх аб’яднанняў ”Современные тенденции в организации мероприятий для детей и подростков в учреждениях культуры“. Былі разгледжаны пытанні разнастайнасці дзейнасці і накірункаў работы клубных фарміраванняў. Праведзены аналіз работы дзіцячых калектываў і аматарскіх аб’яднанняў, клубаў па інтарэсах Шаркаўшчынскага раёна.

На працягу справаздачнага года праведзены шэраг метадычных дзён для кіраўнікоў аматарскіх аб’яднанняў ”Работа аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах. Патрабаванні да запаўнення асноўнай дакументацыі“. У дапамогу кіраўнікам калектываў выдадзены зборнік сцэнарыяў мерапрыемстваў аматарскіх аб’яднанняў ”Свободное время проведём с пользой“, зборнік метадычных рэкамендацый ”Віды і асаблівасці дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў“ для ўдасканальвання і павышэння якасці работы калектываў.

Раённыя семінары-практыкумы для спецыялістаў устаноў культуры клубнага тыпу праведзены: у Глыбоцкім раёне – ”Асаблівасці арганізацыі дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў ва ўстановах культуры, у Верхнядзвінскім раёне – ”Новые творческие активности в практике работы клубных формирований учреждений культуры“, Шумілінскім раёне.

У Лепельскім раёне для кіраўнікоў аматарскіх аб’яднанняў адбылася кансультацыя ”Асаблівасці і спецыфіка працы з аматарскім аб’яднаннем“.

Актыўную творчую і культурна-дасугавую дзейнасць аматарскія аб’яднанні і клубы па інтарэсах вядуць на мясцовым і раённым узроўнях, прымаючы ўдзел у абрадах і святах народнага календара, брэндавых мерапрыемствах.

Так, напрыклад, найбольш значным раённым мерапрыемствам Верхнядзвінскага раёна можна адзначыць свята аматарскай творчасці ”Мы шчаслівыя, калі мы разам“, асноўнай мэтай якога з’яўляецца папулярызацыя дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах, народнай творчасці і мясцовых фальклорных традыцый. У свяце прынялі ўдзел 10 аматарскіх аб’яднанняў устаноў культуры раёна.

У Расонскім раёне з удзелам аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах традыцыйна адбылося раённае свята народнага календара ”Масленіца“, на якім

клубамі нацыянальнай кухні і жаночымі клубамі была прадстаўлена выстава-прэзентацыя масленічнага стала ”Блінная рапсодыя“, падрыхтаваны гульнявыя праграмы, з якімі члены аматарскіх аб’яднанняў прынялі ўдзел: у конкурсе ”Масленічныя карагоды“, у прэзентацыі масленічнай лялькі ”Масленка-краса“. Аматарскія калектывы прымалі ўдзел у свяце, прысвечаным Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, у святах аддаленых вёсак (9), раённым конкурсе гульнявых праграм ”Калі разам гуляць весялей“ і конкурсе выстаў-прэзентацый ”Багая восень натхненнямі“.

З найбольш значных і цікавых мерапрыемстваў Гарадоцкага раёна, у якіх прымалі ўдзел аматарскія калектывы, можна назваць раённы фестываль народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору ”Гарадоцкі Парнас“, раённы кулінарны фестываль ”Мара гурмана“ і свята рыбака ”Поймай удачу!“. У свяце, арганізаваным аматарскім аб’яднаннем ”Большой улов“ Езярышчанскага ГпДК, прынялі ўдзел не толькі мясцовыя арганізацыі і жыхары вёскі, але і творчыя калектывы з гарадоў Расійскай Федэрацыі: Усвяты, Пустошка і Вялікія Лукі.

Аматарскія аб’яднанні і клубы па інтарэсах трывала ўвайшлі ў практыку работы клубных устаноў і філіялаў Шумілінскага раёна, прыцягваючы ўсе ўзроставыя катэгорыі гарадскога і сельскага насельніцтва. На працягу 2024 года ладзіліся сустрэчы гасцей у аграгарадках Шумілiншчыны у рамках двухдзённага раённага аўтапрабега ”100 лет созидания – Шумилинщина юбилейная“, прысвечанага 100-годдзю стварэння Шумілінскага раёна, працавалі на панадворках ”Башнеўскі гасцінец“ у рамках раённага свята хлебаробаў, ладзілі канцэртныя праграмы, арганізоўвалі выставы народнай творчасці і беларускіх нацыянальных страў, прымалі ўдзел у раённых святах і конкурсах.

У вобласці праведзена 4 раённых агляды-конкурсы. У Талачынскім раёне прайшоў раённы конкурс аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах ”Мир наших увлечений – 2024”, у якім прынялі ўдзел 15 аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах устаноў культуры клубнага тыпу раёна. У Лепельскім раёне адбыўся раённы агляд-конкурс сярод дзіцячых аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах ”Мы дзяцінства ў свята ператвараем!“. Раённы конкурс сярод аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах ”Мир твоих увлечений“ праведзены і ў Лёзненскім раёне. Ва Ушацкім раёне у рамках агляду-конкурсу мастацкай самазейнасці сельскіх устаноў культуры клубнага тыпу ”Радуга талантов“ былі прадстаўлены і аматарскія калектывы.

Аматарскія аб’яднанні і клубы па інтарэсах Докшыцкага раёна з’яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі раённых мерапрыемстваў, святаў вёсак і аграгарадкоў, а таксама мясцовых, рэгіянальных брэндаў: свята крыніцы ”Святая вадзіца бацькоўскіх крыніц“, свята чарніц ”Салодкая ягада“, свята сыру ”Сырны разгуляй“, свята нацыянальнай культуры ”Зберагаем вытокі свае“, свята ”Яблычны Спас“, святочнае брэндавае мерапрыемства, прысвечанае збору летняга ўраджаю ”Свята агурка“ і іншых.

Аматарскія клубныя фарміраванні актыўна прымалі ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх, абласных фестывалях, аглядах-конкурсах і іншых мерапрыемствах, якія садзейнічалі развіццю мастацкай творчасці калектываў вобласці, стварэнню новых калектываў, паляпшэнню рэпертуару і ўзроўню выканаўчага майстэрства, духоўнаму адраджэнню грамадства.

Так, клубы нацыянальнай кухні, гульні і фальклору з’яўляліся ўдзельнікамі абласнога фестывалю беларускай нацыянальнай кухні ”Дзвінскі смак“ на тэрыторыі музея-сядзібы Іллі Рэпіна ”Здраўнёва“, прадстаўлялі стравы беларускай кухні на брэндавых пляцоўках падчас Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“ і абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі Віцебскай вобласці ”Дажынкі“.

Аматараў народнай творчасці вобласці ў горадзе Орша аб’яднаў X Міжрэгіянальны фестываль народнай творчасці ветэранаў ”Песня збірае сяброў“, удзельнікам якога стала і літаратурна-музычнае аб’яднанне ”Каларыт“ раённага Дома культуры г.Дуброўна.

Тры аматарскіх аб’яднанні Дубровенскга раёна былі ўдзельнікамі і XXX Міжнароднага фестывалю песні і музыкі ”Дняпроўскія галасы ў Дуброўне“: ”Хозяюшка“, ”Ерамееўскія пачастункі“, ”Асінторфскія ласункі“ сельскіх Дамоў культуры Дубровенскага раёна (агляд-конкурс на лепшы панадворак).

Члены літаратурнага аматарскага аб’яднання ”Світанак“ Цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна прынялі ўдзел у літаратурным конкуре самадзейных паэтаў і кампазітараў імя Алеся Савіцкага ў г.Полацку. Член аматарскага аб’яднання Святлана Аліхвер заваявала дыплом I ступені, Таццяна Куцуха ўзнагароджана дыпломам I ступені ў намінацыі ”Паэзія“ літаратурнага конкурсу ”Наедине с осенью“. У лістападзе калектыў удзельнічалі ў XXXVIII адкрытым фестывалі аўтарскай песні, паэзіі і візуальных мастацтваў ”Віцебскі лістапад – 2024“. Спецыяльным дыпломам ”За искренность прочтения“ ўзнагароджана кіраўнік аб’яднання Марына Кавалёнак. Аматарскія аб’яднанні: ”Сяльчанка“ Парыжскага СДК, ”Суседкі“ Ярэўскага сельскага клуба, ”Гаспадынька“ Гуцкага СКЦ, прымалі ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе сельскіх падвор’яў ”Пастаўшчына гасцінная“ ў межах XXXIV Міжнароднага фестывалю народнай музыкі ”Звіняць цымбалы і гармонік“. Аматарскае аб’яднанне ”Сяльчанка“ Парыжскага СДК прыняла актыўны ўдзел у правядзенні выстаў-дэгустацый страў – элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў рамках ”Тыдня Смаку“.

У святе сярэднявечнай культуры “Меч Брачыслава”, якое праходзіла ў рамках Міжнароднага свята традыцыйнай культуры ”Браслаўскія зарніцы“ прынялі ўдзел: клуб гістарычнай рэканструкцыі ”Чорны война“ і клуб гістарычнай рэканструкцыі і мініяцюры ”Шчыт“ г.Наваполацка; клуб жывой гісторыі ”Хальвіль“ і клуб гістарычнай рэканструкцыі і мадэлявання ”Шаркань“ г.Віцебска.

На базе ўстаноў культуры г.Орша, г.Полацка і аг.Ноўка Віцебскага раёна праведзены абласны агляд-конкурс творчасці ветэранскіх калектываў ”Не

старэюць душой ветэраны“, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У конкурсе прынялі ўдзел 140 творчых калектываў і індывідуальных выканаўцаў агульнай колькасцю больш за 850 чалавек, сярод якіх былі актыўныя ўдзельнікі аматарскіх калектываў і клубаў па інтарэсах. Праграма агляду-конкурсу прадугледжвала конкурсныя выступленні па асноўных жанравых напрамках: вакальна-харавы, харэаграфічны, музычна-інструментальны, фальклорны, тэатральны.

15 чэрвеня ў аг.Ноўка Віцебскага раёна прайшоў III абласны фестываль вулічнага мастацтва ”Волаты Прыдзвіння“, прысвечаны жыццю і дзейнасці ўраджэнца Віцебскага раёна Фёдара Махнова. У рамках фестывалю праведзена два конкурсных мерапрыемствы: конкурс вулічных музычных і цыркавых прадстаўленняў па намінацыях: ”Музычнае мастацтва. Імправізацыя“, ”Цыркавое шоў“ і конкурс выканаўцаў вулічных танцаў ”Танцуй сэрцам“. У мерапрыемстве прынялі ўдзел аматарскія калектывы і асобныя выканаўцы, выхаванцы цыркавых, харэаграфічных, тэатральных калектываў і іншых студый ва ўзроставай катэгорыі ад 6 да 35 гадоў з г.Віцебска, г.Наваполацка, г.Оршы; Віцебскага, Глыбоцкага, Лепельскага, Аршанскага, Пастаўскага раёнаў.

Не абыйшлося без удзельнікаў аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах і на XIV Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, дзе 10 дыяспар (рускія, яўрэі, малдаване, казахі, украінцы, мардвіны, узбекі, башкірцы, ланкійцы, азербайджанцы) прадставілі Віцебскую вобласць. На нацыянальных падворках былі арганізаваны выступленні творчых калектываў, размешчаны выставы народных рамёстваў і нацыянальныя кухні. У рамках фестывалю была арганізавана работа беларускага падворка, у якім прынялі ўдзел аматары народнай творчасці Шаркаўшчынскага раёна, клуб ”Семья“ Славенскага сельскага Дома культуры ДУК ”Талачынскі РЦКіНТ“ і іншыя (7,8.06.2024, г.Гродна).

21 верасня 2024 года ў рамках штогадовага экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“ адбылася абласная інтэрактыўная выстава-конкурс мастацкіх вырабаў ”Птушыны перапалох“. У мерапрыемстве прынялі ўдзел 74 майстры аматарскіх калектываў Віцебскай вобласці. Конкурсныя работы былі прадстаўлены ў наступных намінацыях: ”Лепшая шпакоўня для зімуючых птушак“, ”Лепшая выява птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі“, ”Лепшая мастацкая кампазіцыя з беларускіх птушак“ і ”Лепшая распрацоўка сувеніра да свята“.

У XIII Рэгіянальным фестывалі народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў ”Дрыбінскія таржкі“ прынялі ўдзел: аматарскае аб’яднанне ”Ерамееўскія пачастункі“ філіял ”Ерамееўскі сельскі Дом культуры“ ДУК “Раённы цэнтр народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскга раёна” і народнае аматарскае аб’яднанне ”Земное время“ ДУК ”Аршанскі гарадскі цэнтр культуры ”Перамога“, (17.08.2024, г.п.Дрыбін Магілёўскай вобласці).

На базе Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту ў аг.Азярцо Мінскага раёна аматарскія калектывы і майстры Лепельскага і Чашніцкага раёнаў з мэтай папулярызацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны прынялі ўдзел у мерапрыемствах: ”Практыкі саломапляцення“ (27.04.2024); ”Традыцыйная страва ”Клёцкі з ”душамі“ (02.11.2024).

Клубы мастакоў і майстроў народных мастацкіх рамёстваў з усіх раёнаў вобласці сталі актыўнымі ўдзельнікамі шэрагу абласных выстаў-конкурсаў: выстава артэфактаў ”Рэліквія“; выстава набіванкі ”Віцебская набойка“, выстава-конкурс інсітнага мастацтва ”Пад мірным небам“; прысвечаная 80-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ”Віцебск у мініяцюры“, прысвечаная 1050-годдзю г.Віцебска; выстава-конкурс аўтарскіх і батлеечных лялек ”З запаветных дзіцячых сноў“; выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ”У люстэрку міфалогіі“; выстава-продаж сувеніраў ”Дызайн – працяг традыцый“; выставы-конкурсы па вясковаму і местачковаму інтэр’ернаму тэкстылю Віцебшчыны: ”У роднай хатцы на Віцебскім Падзвінні“, ”У роднай хатцы на Віцебскім Падняпроўі“ і ”У роднай хатцы на Паазер’і“.

Для больш плённай і мэтанакіраванай працы аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах установ культуры клубнага тыпу Віцебскай вобласці неабходна звярнуць увагу на напаўняльнасць аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах згодна Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры; вызначыць прыярытэтную жанравую накіраванасць аб’яднанняў з найменнем ”народны“, ”узорны“; актывізаваць удзел аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах у рэспубліканскіх і абласных фестывалях, святах, аглядах-конкурсах.